Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 214 (5047)
ВЕРАСНЯ
24
ПАНЯДЗЕЛАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ У НУМАРЫ:

ПРАМОВА тав. ОРДЖАНІКІДЗЕ ПРЫ АДКРЫЦЦІ НАРАДЫ РАБОТНІКАЎ ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ 20 ВЕРАСНЯ 1934 г. (2 СТАР.).

АРТЫКУЛ ГЕРАЎКЕРА — АСТАЛІСЯ РАШАЮЧЫЯ ДНІ.

АРТЫКУЛ ГОРЫНА—ДА АДКРЫЦЦЯ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ПРЫ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСЫТЭЦЕ.

НАРЫС Б. ПАСКАНЬЕВА І С. РУБЕЖЫНА—МЕХАНІК І ПРЭЗІДЭНТ.

ЗА РУБЯЖ.м:

КАНГРЭС «МІЖНАРОДНАЙ ПАЦЫФІСЦКАЙ ЛІГІ».

АДСТУПЛЕННЕ ПОЛЬШЧЫ Ў ЖЭНЕВЕ.

РАЗНАГАЛОССІ У КІРАЎНІЦТВЕ РЭЙХСВЕРА.

ПРЫВІТАННЕ ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

НАРАДЫ ГАСПАДАРНІКАЎ, ІНЖЫНЕРАЎ, ТЭХНІКАЎ, ПАРТЫЙНЫХ І ПРОФСАЮЗНЫХ РАБОТНІКАЎ ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Натхняцелю і арганізатару перамог соцыялістычнай індустрыялізацыі, любімаму правадыру працоўных, вялікаму Сталіну нарада работнікаў цяжкай прамысловасці шле палкае прывітанне.

У гады, калі наша прамысловасць рабіла толькі першыя крокі на шляху свайго аднаўлення, ты, верны вучань бяссмертнага Леніна, з геніяльнай празорлівасцю правадыра, які глядзіць углыб надыходзячых год, даў нам і ўсёй партыі вялікую праграму соцыялістычнай індустрыялізацыі.

З гэтай праграмай, як з баявым сцягам, над тваім непасрэдным кіраўніцтвам, пры тваёй штодзённай клапатлівай увазе рабочы клас, ахоплены магутным пафасам будаўніцтва, стварыў у гады першай пяцігодкі магутную соцыялістычную індустрыю, аснашчоную першакласным абсталяваннем.

Пад тваім мудрым кіраўніцтвам выкоўваліся кадры работнікаў прамысловасці, стваралася новая вытворча-тэхнічная інтэлігенцыя рабочага класа.

У гады бурнага разгортвання соцыялістычнай рэканструкцыі ты кінуў лозунг «Большэвікі павінны аўладаць тэхнікай», ты ўказаў нам 6 умоў перамогі, ты заклікаў цаноўніць пафас будаўніцтва пафасам асваення, і твае ўказанні сталі несакрушальнай асновай новых поспехаў соцыялістычнай індустрыялізацыі.

Мы, заканчваючы работу сваёй нарады, запэўніваем цябе, дарагі таварыш Сталін, наш друг, правадыр і настаўнік, што мы здолеем зноў і зноў даказаць—няма такіх крэпасцей, якіх не маглі-б узяць большэвікі.

Мы запэўніваем, што пад кіраўніцтвам узначальваемага табой ленінскага ЦК нашай вялікай Комуністычнай партыі 6-мільённая армія цяжкай прамысловасці разгорне большэвіцкую барацьбу за мабілізацыю ўсіх рэзерваў цяжкай індустрыі, каб выканаць план 1934 года і ва ўсесаюзнае сустрэць праці год 2-й пяцігодкі.

Нехай жыве наш ленінскі ЦК!

Няхай жыве наш Сталін, вялікі арганізатар вялікіх перамог.

МАСКВА. ЦК ВКП(б)—ЮСІФУ ВІСАРЫЁНАВІЧУ СТАЛІНУ

Дарагі Юсіф Вісарыёнавіч! Тэлеграма ад Вашага імя з'явілася для мяне вышэйшай узнагародай за ўсе 80 год майго жыцця. Яна даражэй мне за ўсякія іншыя ўзнагароды.

Я шчасліў Вашаю вялікаю ўвагаю

Мітурынск, 23 верасня. Ваш **І. Мічурын.**

БЛІЖЭЙ ДА МАС

У пленум ЦСПСБ, які скончыў гэтымі днямі сваю работу, павінен быў вырашыць асноўныя задачы, якія стаяць перад профрухам БССР на даным этапе. А задачы гэтыя ясна пастаўлены ў пастанове ЦК КП(б)Б аб рабоце профсаюзаў БССР. Яны зусім чотка акрэслены ў рашэннях XVII з'езда партыі, у пастановах Камісіі Партыйнага Кантролю і ў апошняй пастанове IV пленума **ВЦСПС** аб разбуйненні профсаюзаў, якое вынікае з рашэнняў XVII з'езда партыі.

І асноўную задачу профсаюзаў на сучасны перыяд можна характарызаваць—**бліжэй да мас.**

Бліжэй да мас, якія незвычайна ўзраслі і прад'яўляюць павышаныя патрабаванні да профсаюзаў.

Бліжэй да мас, якія сваёй штодзённай работай упарта змагаюцца за выкананне планаў другой пяцігодкі.

Неадрыўная сувязь з масамі заўсёды з'яўлялася асноўным прынцыпам работы совецкіх профсаюзаў, наогул, а зараз, на сучасным этапе, у асаблівасці.

І гэта зусім зразумела. Разам з ростам усёй народнай гаспадаркі расце рабочы клас. Ён расце і колькасна і якасна. За апошнія гады неымерна павялічылася колькасць членаў саюза.

Саюз рабочых жывёлагадоўчых соўгасаў вырас з **11.000** у 1932 годзе да **22.000** у 1934 годзе. Саюз работнікаў кааперацыі ўзрос з **17.000** у 1931 годзе да **25.000** у гэтым годзе. Рост колькасці членаў мы маем па ўсіх саюзах, у адных у большай ступені, у другіх у меншай.

Значыць, пры сучасным становішчы работы, пры такім росце профсаюзаў немінуча выцякаў адрыў асобных звенняў ад мас, слабасць работы на радзе ўчасткаў.

Рашэнні пленума Камісіі Партыйнага кантролю аб кантрольнай рабоце профсаюзаў, комсамола і друку, перадача профсаюзам функцый Наркамцяжпрацы яшчэ больш узнялі адказнасць профсаюзаў, ускладнілі іх задачы.

Такім чынам, наспела неабходнасць у карэннай перабудове работы профсаюзаў, у такой перабудове, якая-б падняла профсаюзы на ўзровень задач другой пяцігодкі.

Пленум ЦСПСБ скончыў сваю работу. Задачы з усёй яснасцю акрэслены. Мерапрыемствы па перабудове намечаны.

Што патрабуецца зараз? Сапраўды **дзелавая перабудова**, разуменне кожным профработнікам, што перабудова профсаюзаў не ёсць змена шыльд і што нельга працаваць па-старому.

Побач з дадатнымі вынікамі работы, у балансе профсаюзаў ёсць нямала недахопаў. На ліквідацыю гэтых недахопаў павінна быць звернута ўся ўвага профсаюзаў.

І першая задача—як мага хутчэй закончыць арганізацыйную перабудову і прыступіць да арганізацыі шырокага рабочага актыва, звязанага з вытворчасцю, ведаючага, чым жыве і што патрабуе кожны рабочы паасобку.

Да гэтага-ж адносіцца кіраўніцтва групамі масавага рабочага кантролю. Не дапускаць **перагібаў у арганізацыйных пытаннях**, накіраваць агонь брыгад масавага рабочага кантролю супроць усіх дармаедаў, злодзеяў, якія прымайстраваліся ў ЗРК, ОРСы, сталовыя, каб там расцягваць матэрыяльныя каштоўнасці, прызначаныя для працоўных мас. Сюды, на гэты ўчастак—асаблівую ўвагу.

Трэба падцягнуць адсталы ўчастак—работу на вёсцы. Мы пісалі ўжо аб рабоце асобных рабачкомаў соўгасаў. Яны працуюць дрэнна. А колькасць членаў сельскіх саюзаў вырасла на многія тысячы чалавек. Сюды—**у соўгас, на торфзавод, на лесараспрацоўкі, на ажыццяўленне пролетарскага шэфства над вёскай**—павінна быць накіравана ўвага саюзаў. Работа сельскіх саюзаў павінна быць значна ўмацавана.

Наступная задача—першачарговы абавязак профсаюзаў—змагацца за паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў рабочых, і ў першую чаргу за ўзорную падрыхтоўку да зімы. Мы дабіліся значных поспехаў у надзялення рабочых індывідуальнымі гаспадаркамі. Гэты поспех трэба замацаваць падрыхтоўкай да сяўбы будучага года і ўборкай ураджаю гародніны гэтага года.

Барацьба за паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў, за поўнае выкарыстанне фондаў па ахове працы, супроць парушэння працоўнага законадаўства—таксама адна з важнейшых задач профсаюзаў.

Як задача вялікай важнасці ўстае арганізацыя **культурна-масавай і інтэрнацыянальна-выхаваўчай** работы. Пленум адзначыў гэту работу, як **закінуты ўчастак.** Яе трэба падцягнуць. Больш увагі **клубу, бібліятэцы, гуртку.** Больш **увагі да культурнага работніка.**

Пленум пастанавіў уключыцца ўсёй профсаюзнай арганізацыі ва **ўсесаюзны вытворча-бытавы паход імя VII з'езда Советаў. Гэта важнае рашэнне і вялікае абавязацельства.** Трэба, каб гэта рашэнне пленума, як і ўсе яго пастановы, пастанова ЦК КП(б)Б аб рабоце профсаюзаў, пастанова пленума ЦСПСБ аб перабудове профсаюзаў былі зараз-жа даведзены да шырокіх працоўных мас, каб усесаюзны паход ператварыўся ў шырокі масавы паход за выкананне плана другога года другой пяцігодкі, за тэхнічную вучобу, за культурную працу і далейшае паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў рабочых.

АБ МЯСАПАСТАЎКАХ І АДГРУЗЦЫ ЛЕНІНГРАДУ

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

ЦК адзначае, што, не гледзячы на прамое ўказанне ЦК аб тым, што мясапастаўкі — гэта такая-ж справа, па сваёй сур'ёзнасці, як і хлебапастаўкі, не гледзячы на адпаведныя рашэнні па мясапастаўках пленума ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б і рад пастаноў Бюро ЦК і тэлеграм з канкрэтнымі практычнымі прапановамі, рад раёнаў: Лёзненскі, Бешанковіцкі, Веткаўскі, Хойніцкі і інш. прадаўжаюць займацца адпіскай, славеснай дэкларацыяй, заклінаннем замест большэвіцкай арганізацыі справы мясапаставак.

У разультаце квартальны план выкананя на 64,2 проц., а такія раёны, як Лёзненскі, Бешанковіцкі, Веткаўскі і інш., выканалі 21-31 проц., па сутнасці справы сарваўшы выкананне квартальнага плана па раёну.

ЦК лічыць такое становішча зусім нецярпімым і прапануе:

1. Устанавіць у ГК і РК абмеркаванне разультатаў кожнай пяціднеўкі па мясапастаўках, таксама як па хлебу, з неадкладным прыняццем мер па ўзмацненню работы. Адказнымі за своечасовую дачу пяціднеўных зводак з'яўляюцца ў раёне заг. райзаготжывёлы і старшыня РВК.

2. Абавязаць тав. Сідарава (Белзаготжывёла) арганізаваць у сваім апараце складанне пяціднеўных разультатаў мясапаставак па БССР і адгрузцы Ленінграду (не парушаючы дзяннай справаздачнасці) і рассылаць у ЦК і іншыя цэнтральныя органы ў парадку, устаноўленым для пяцідневак па хлебапастаўцы.

3. Устанавіць такі-ж парадак аператыўнага кіраўніцтва мясапастаўкамі па жывёлагадоўчых трэстах і Упоўнаркомсоўгасаў.

4. Абавязаць цэнтральны і раённы друк публікаваць зводкі аб ходзе мясапаставак і адгрузкі Ленінграду, таксама як па пяціднеўках аб хлебапастаўках, даваць аналіз і заўвагі з паказам адстаючых і перадавых раёнаў.

5. Абавязаць камісію па соцспаборніцтву з Заходняй вобласцю ўключаць мясапастаўкі як асноўны паказальнік для ацэнкі раёна ў соцспаборніцтве.

6. Абавязаць РК партыі там, дзе ў райзаготжывёле няма загадчыка, неадкладна выдзеліць з раённага актыва найбольш талковага работніка для гэтай работы. У астатніх раёнах РК абавязаны неадкладна ўзмацніць апараты Заготжывёлы адпаведнымі работнікамі.

Даручыць сельгасаддзелу ЦК праверыць выкананне як даннай дырэктывы, так і пастановы Бюро ЦК ад 17-VII аб ачыстцы і ўмацаванні апарата Заготжывёлы і на наступным пасяджэнні Бюро далажыць аб рэалізацыі гэтых пастаноў па раёнах.

7. Лічыць недапушчальным перакідку плешчаніцкім РК КП(б)Б кіраўніка канторы райзаготжывёлы тав. Угольнікава на іншую работу без згоды Белканторы Заготжывёлы. Адмяніць рашэнне плешчаніцкага РК аб перакідцы т. Угольнікава на іншую работу.

8. Абавязаць старшыню РВК асабіста праверыць, як выконваюцца па раёну ўказанні пленума ЦК ВКП(б) аб прыраўнанні норм мясаздачы калгаснікамі калгасаў, маючых фермы і невыканаўшых плана, да норм здачы калгаснікаў калгасаў, не маючых ферм, забяспечыўшы спаўнанне мяса да 1-X—1934 г.

9. Неабходна РК, РВК і загатоўчым арганізацыям адначасова з узмацненнем мясапаставак забяспечыць своечасовую і поўную адгрузку мяса Ленінграду, не дапускаючы выпадкаў нескарыстання вагонаў.

За нескарыстанне жнівеньскай нормы вагонаў пад адгрузку жывёлы Ленінграду абвясціць суровую вымову кіраўніку старадарожскай райканторы Заготжывёлы тав. Вайнзафу. Абавязаць тав. Сідарава арганізаваць у сябе ў апараце, а таксама ў райзаготканторах аператыўнае кіраўніцтва перасоўкай загатоўленай жывёлы ў раёны падачы вагонаў, выдзеліўшы для гэтага адказных работнікаў.

10. Партыйныя і совецкія арганізацыі Лёзненскага і Бешанковіцкага раёнаў з'яўляюцца найбольш адстаючымі па выкананню плана мясапаставак. Не гледзячы на неаднаразовыя папярэджанні ад ЦК спецыяльнымі пастановамі і шляхам тэлеграм, яны не зразумелі і недаацанілі таго, што пытанне мясапаставак гэта перш за ўсё пытанне снабжэння рабочага класа, Чырвонай арміі, і пустымі размовамі і абіцаннямі змазвалі жывую справу.

ЦК пакуль абмяжоўваецца вынясеннем вымовы сакратарам указаных РК тт. Дзешкевічу і Каждану і старшыням РВК тт. Шульге і Грышчанка з папярэджаннем, што, калі на аснове гэтага рашэння ЦК імі не будуць зроблены адпаведныя вывады і не будзе створан пералом у мясазагатоўках па працягу бліжэйшых-жа дзён па выкананню верасноўскага плана, ЦК вымушан будзе да іх прыняць усе меры партсправання, якія прымяняюцца ў адносінах невыканання хлебаздачы.

11. Даручыць тт. Валковічу і Картэлову выклікаць у ЦК кіраўнікоў лёзненскай і бешанковіцкай кантор Заготжывёлы тт. Дзямідава і Саседа, заслухаць тлумачэнні прычын недапушчальнага становішча з мясаздачай у іх раёнах і ўнесці прапанову аб далейшай іх рабоце і пакаранні іх.

12. Запатрабаваць тлумачэння ад сакратароў Аршанскага, Магілеўскага і Касцюковіцкага РК КП(б)Б, чаму знятыя пастановай ЦК і СНК з работы тт. Бабоўнікаў, Бажанаў і Дукшт — кіраўнікі раённых кантор Заготжывёлы — лічацца яшчэ на рабоце, у разультаце чаго работа правалена.

13. Даручыць дырэктару Менскага свінаводтрэста прадставіць у ЦК падрабязны матэрыял аб становішчы соўгаса Вяснова, а таксама намеціць мерапрыемствы па яго ўмацаванню, пасля чаго даць спецыяльнае рашэнне па гэтаму соўгасу.

14. Адзначыць, што план мясаздачы, устаноўлены для сельпо і млынавых прадпрыемстваў, выконваецца недапушчальна слаба.

Прыняць да ведама заяву тав. Баскіна, што па лініі сельпо да 1 кастрычніка план будзе поўнасцю выканан.

Абавязаць тав. Бальціна і старшынь РВК безумоўна выканаць план мясапаставак па прадпрыемствах сельскага мукамолля, кіруючыся ўказаннямі совецкага кантроля 15-IX—34 г.

15. Магілеўскі і Лёзненскі палітаддзелы, якія пяндрэнна справіліся з хлебаздачай, у той-жа час недастаткова аддаюць увагу здачы мяса калгаснымі фермамі. ЦК абавязвае іх, а таксама і астатнія палітаддзелы павярнуцца як след да справы мясаздачы і забяспечыць своечасовае выкананне квартальнага і гадавога плана калгасамі зоны дзейнасці МТС.

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТВУ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

Сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР пакінуць за АРШАНСКІМ раёнам. Папярэдзіць кіраўніцтва раёна аб недапушчальна нізкіх тэмпах мясазагатовак (ніжэй сярэдняй лічбы па БССР).

Кандыдатамі на атрыманне сцяга пакінуць МЕНСКІ, СЛУЦКІ і БАРЫСАЎСКІ раёны. У другі раз папярэдзіць кіраўніцтва гэтых раёнаў аб недапушчальным адставанні ў апрацоўцы і здачы ільнапрадукцыі. Асобна папярэдзіць Менскі раён аб неабходнасці ліквідацыі адставання па зяблеваму ворыву і мясазагатоўках, а Барысаўскі раён—па мясазагатоўках.

Адзначыць, што і за гэту пяціднеўку ні адзін з раёнаў ільняной зоны не заваяваў права на атрыманне сцяга ЦК і СНК.

Па якасці здаваемага ільнавалакна і тэмпах мясазагатовак (115,6 проц.) ДРЫСЕНСКІ раён мае права на атрыманне чырвонага сцяга па ільняной зоне. Але ўлічваючы адставанне па зяблеваму ворыву, уборцы і загатоўцы бульбы, пакінуць Дрысенскі раён першым кандыдатам на атрыманне чырвонага сцяга.

У ліку іншых кандыдатаў на атрыманне сцяга па ільняной зоне пакінуць СЕННЕНСКІ. За ганебны зрыў мясапаставак зняць з кандыдатаў на атрыманне чырвонага сцяга Лёзненскі і Бешанковіцкі раёны.

Адзначыць недапушчальнае адставанне з зяблевым ворывам Сенненскага раёна.

Указаць кіраўніцтву Сенненскага раёна на недапушчальнае адставанне ў мясазагатоўках.

Камісія папярэджвае большасць ільнаводчых раёнаў аб недапушчальным адставанні з уздымам ільну са сцелішча. Боль ш за ўсё лён перапежвае ў раёнах: Гарадоцкім—2.822 гектараў, Сіроцінскім—2.790, Лепельскім—2.269, Сенненскім—2.011, Ушацкім—1.855, Шклоўскім—1.700, Лёзненскім—1.621, Дрысенскім—1.290, Полацкім—1.285, Суражскім—1.266 і Чашніцкім—1.250 гектараў.

Сцяг палітсэктара МТС пакінуць за Рагачоўскай МТС. Кандыдатамі пакінуць Аршанскую і Церахаўскую МТС. Дадаткова зялічыць кандыдатам Хойніцкую МТС, папярэдзіўшы яе аб недапушчальнасці адставання па мясазагатоўках.

Камісія адзначае, што Дубровенскі, Мсціслаўскі, Чашніцкі, Лепельскі, Старобінскі, Плешчаніцкі, Суражскі, Шклоўскі, Пухавіцкі, Кармянскі, Чырвонапольскі і Быхаўскі раёны дагэтуль не ліквідавалі свайго адставання па хлебаздачы і адстаюць таксама па ўсіх іншых асноўных сельскагаспадарчых кампаніях.

Камісія ў апошні раз папярэджвае гэтыя раёны, што калі яны ў бліжэйшую пяціднеўку не ліквідуюць свайго адставання, яны будуць занесены на чорную дошку.

ЗЛЁТ ЛЕПШЫХ МЯЛЬШЧЫЦ І ТРАПАЛЬШЧЫЦ ЛЁЗНЕНШЧЫНЫ

ЛЁЗНА. (Па тэлефону ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Адбыўся раённы злёт лепшых мяльшчыц і трапальшчыц. 300 ударніц калгасаў Лёзненшчыны перадавалі свой вопыт барацьбы за высокаякасны лён.

Нам. старшыні калгаса «9 студзеня» па ільну **Ганна Шляхтава** расказала злёту, як калгас дабіўся першынства ў раёне, датэрміново здаўшы валакно дзяржаве выключна 18 нумарам. Гэты калгас атрымаў з гектара па 4 цэнт. валакна.

Трапальшчыца калгаса «Апора советаў» Малання Каралёва расказала, як яна дабілася на трапанні валакна 18 нумару. Калгас «Апора советаў» адным з першых у раёне выканаў план здачы ільнавалакна дзяржаве. Гэты дзень работы злёта ператварыўся ў вялікае свята. У раён прыляцела эскадрылья самалётаў. Лепшыя ўдарніцы-трапальшчыцы Надзя Шляхтава, Аўдоцця Кавалёва, Матрона Пятрыцкая і Дуня Марчанка першы раз падніміліся на самалёце.

На злёце прысутнічалі пом. нач. палітсэктара МТС Наркамзема па жоўрабоце тав. **Сандлер**, дырэктар белканторы «Заготлён» т. **Вайновіч** і дэлегацыя ад Рудзянскага раёна Заходняй вобласці.

ЛОСЬ.

Зводка аб ходзе с.-г. кампаніі па раёнах на 20 верасня 1934 г. будзе змешчана ў наступным нумары «Звязды».

У ЦК ВКП(б)

АБ ГОМЕЛЬСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

ЦК ВКП(б) заслухаў паведамленне аб становішчы Гомельскай партарганізацыі. У прынятай пастанове ЦК партыі канстатуе недастатковую ідэйную згуртаванасць гомельскай партарганізацыі і слабасць унутрыпартыйнай работы. ЦК адзначае, што сапраўдную перабудову партыйнай работы, канкрэтнае кіраўніцтва первічнымі партарганізацыямі гарком падмяніў знадворна-паказной шуміхай, вынясеннем агульна-дэкларатыўных разалюцый і рашэнняў. На працягу апошняга года бюро гаркома на сваіх пасяджэннях не заслухала ні аднаго даклада пэхавага партарганізатара, парторгрупы або асобнага камуніста, не паставіла ні аднаго пытання ўнутрыпартыйнай работы, не гледзячы на значнае адставанне яе важнейшых участкаў (марксісцка-ленінскае выхаванне, арганізацыя парт.- і палітдзён, работа са спачуваючымі, учот комуністаў і т. д.).

Адначасова пастанова ЦК адзначае, што няведанне кадраў, несур'ёзнасць іх падбору, адсутнасць дапамогі гаркома ім у рабоце прывялі да вялікай цякучасці і змяняемасці кіруючых работнікаў у арганізацыі.

Адставанне ўнутрыпартыйнай работы ў гомельскай арганізацыі, няўменне ўвязаць яе з рашэннем гаспадарчых задач сказаліся і тым, што пераважная большасць важнейшых прадпрыемстваў горада сістэматычна не выконвае сваіх промфінпланаў. Асабліва адстае выкананне якасных паказальнікаў. На многіх прамысловых прадпрыемствах маюць месц прагулы, значная цякучасць рабочай сілы, высокі брак прадукцыі, дрэнна пастаўлена культурна-бытавое абслугоўванне рабочых.

У сваёй пастанове ЦК адзначае таксама бытавое разлажэнне паасобных работнікаў актыва.

ЦК указаў бюро гомельскага гаркома і яго сакратару тав. **Шафарэнку** на недапушчальныя метады ў кіраўніцтве, адміністраванне і грубасць замест настойлівай работы па выхаванні кадраў.

ЦК абавязаў гомельскі гарком мабілізаваць партарганізацыю, рабочых і калгаснікаў на выкананне задач, пастаўленых перад гомельскай партарганізацыяй.

(«ПРАВДА»).

ПРЫВІТАННЕ ТАВАРЫШУ ГІКАЛО

ад агульна-гарадскога схода партыйнага, совецкага прафсаюзнага і комсамольскага актыва Віцебска

1.400 удзельнікаў аб'яднанага агульнагарадскога схода партыйнага, совецкага, прафсаюзнага і комсамольскага актыва Віцебска, прафсаюзнага актыва, пасылаючы нага нумара баявой газеты большэвікоў Віцебска — «Віцебскі пролетарый» — шле табе, баявому кіраўніку КП(б)Б, сваё палкае большэвіцкае прывітанне. Актыў запэўнівае тав. Гікало, а ў яго асобе ЦК, што пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта віцебская партыйная арганізацыя яшчэ больш востра адточыць моцную зброю большэвіцкай самакрытыкі, з яшчэ большай настойлівасцю будзе змагацца за выкананне велізарнейшых задач, пастаўленых XVII з'ездам ў дакладзе правадыра таварыша Сталіна. Віцебская партыйная арганізацыя, узначальваючы найшырэйшыя масы рабочых, калгаснікаў, працоўных, прыложыць усе сілы, каб вывесці віцебскую партыйную арганізацыю ў першыя рады КП(б)Б.

Няхай жыве ЦК ВКП(б) на чале з вялікім і любімым правадыром нашай магутнейшай большэвіцкай партыі і працоўных усяго свету таварышом **Сталіным!**

Няхай жыве ЦК КП(б)Б і яго жалезны кіраўнік тав. **Гікало!**

Няхай жыве большэвіцкі друк — самая моцная зброя партыі!

ПРЭЗІДЫУМ.

ПРЫВІТАННЕ тав. Н. М. ГАЛАДЗЕДУ

У адказ на ваша прывітанне віцебскай партыйнай арганізацыі і працоўным раёна з выхадам пяцітысячнага нумара баявой газеты віцебскіх большэвікоў **«Віцебскі пролетарый»**, 1.400 ударнікаў агульнагарадскога схода партыйнага, совецкага, комсамольскага і прафсаюзнага актыва, пасылаючы сваё палкае большэвіцкае прывітанне вам — старшыні ўрада Совецкай Беларусі — запэўніваюць урад БССР, што мы, і ў далейшым будзем няўхільна змагацца за генеральную лінію партыі, ажыццяўленне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, яшчэ астрэй адточым сваю магутную зброю — друк—накіруем усе свае сілы, энергію на тое, каб віцебская прамысловасць была ў самых перадавых радах БССР, каб сельская гаспадарка, жывёлагадоўля нашага раёна квітнелі; каб нашы калгасы ўсе сталі большэвіцкімі, а калгаснікі заможнымі; каб Віцебскі раён быў вядучым у паўночнай зоне раёнаў БССР; каб была забяспечана ўзорная падрыхтоўка да надыходзячага ўсебеларускага з'езда Советаў.

Няхай жыве вялікая партыя большэвікоў на чале з правадыром таварышам **Сталіным!**

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з выпрабаваным ленінцам тав. **Гікало!**

Няхай жыве большэвіцкі друк — самая магутная, самая вострая зброя партыі!

ПРЭЗІДЫУМ.

РАЗГОРТВАЕЦЦА СПАБОРНІЦТВА ЧЫГУНАЧНІКАЎ І ВОДНІКАЎ

ГОМЕЛЬ, 23 верасня. (Па тэлефону ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Бюро Гомельскага гаркома і палітаддзел аддзялення службы эксплаатацыі ў прынятай учора пастанове аб падрыхтоўцы да асенне-зімовых перавозак, спецыяльным пунктам ухваляюць прапанову «Звязды» (перадавы артыкул у № 208) аб арганізацыі спаборніцтва чыгуначнікаў і воднікаў на хутчэйшую і добраякасную адгрузку і дастаўку бульбы і гародніны пролетарскім цэнтрам. Гарком і палітаддзел прапанавалі партыйнай і профсаюзнай арганізацыям чыгункі на аснове масавай палітычнай работы шырока разгарнуць дзелавое спаборніцтва паміж чыгуначнікамі і воднікамі. Газетам «Палескай праўдзе», «На соцыялістычных рэйках» і «Беларускі фарватар» прапанавана разгарнуць арганізацыйна-масавую работу і штодзённае асвятленне ходу спаборніцтва.

Партком гомельскай прыстані абгаварыў на сваім пасяджэнні прапанову, высунутую ў перадавым артыкуле «Звязды». У сваім рашэнні партыйны камітэт вітае ініцыятыву «Звязды», заклікаючы ўсіх рабочых і служачых прыстані і парта ўключыцца ў соцспаборніцтва. Для правядзення масава-растлумачальнай работы да кожнага судна і брыгады грузчыкаў прымацаваны актыў.

Сёння адбылася сустрэча грыкутнікаў прыстані і гомельскай чыгуначнай станцыі, на якой былі абгавораны практычныя пытанні, звязаныя са спаборніцтвам.

ДОДЗІН.

Мабілізаваць рэзервы цяжкай прамысловасці, выканаць і перавыканаць гадавы план

З прамовы тав. ОРДЖАНІКІДЗЕ пры адкрыцці нарады работнікаў цяжкай прамысловасці 20 верасня 1934 г.

У пачатку свайго выступлення тав. Орджанікідзе гаворыць, што такая нарада склікана для абмеркавання двух пытанняў: як выканаць праграму квартала і тым самым выканаць і перавыканаць праграму 1934 года, і як падрыхтавана цяжкая прамысловасць да гэтага.

— Зусім натуральна запытацца ставіць пытанне тав. Орджанікідзе—як мы працавалі за гэтыя месяцы і 20 дзён.

Цяжкая прамысловасць па плану, зацверджанаму на сесіі ЦВК СССР, павінна даць у гэтым годзе на 19.770 млн. рубл. прадукцыі прырост супроць мінулага года 3,2 проц.

У першым паўгоддзі мы павялічылі выпуск прадукцыі ў параўнанні з першым паўгоддзем мінулага года на 29,2 проц. У ліпені жніўні намецілся некаторы спад. У ліпені мы працавалі значна горш, чым у чэрвені. У жніўні—невялікі пад'ём, маленечкі крок наперад, але ўзровень вытворчасці застаўся ніжэй чэрвеньскага. І ў гэтым годзе гэтыя два летніх месяцы аказаліся тымі месяцамі, калі звычайна «качалі» нашу прамысловасць у мінулыя гады. У гэтай сезоннасці адлюстроўвалася адсталасць. У гэтыя-ж летнія месяцы і ў 1934 г. мела месца значна меншае вытворчасці, праўда, значна меншае, чым у папярэднія гады.

За 8 месяцаў мы далі прадукцыі на 12.816 млн. руб., што складае прырост супроць 8 месяцаў мінулага года на 28,4 проц. Каб выканаць урадавае заданне, астаецца выпусціць у IV квартале на 5.670 млн. рубл. прадукцыі. Каля 5.100 млн. рублёў мы, як відаць, дамо ў III квартале.

Да той масы прадукцыі, якую мы даем у III квартале, асабліва вялікай прыбаўкі ў IV квартале не будзе патрэбна, каб выканаць квартальную праграму і ўвесь гадавы план.

За 7 месяцаў мы дабіліся зніжэння сабекошту не менш 5 проц. Прадукцыйнасць працы за 8 месяцаў мы павысілі на 11,8 проц. Такім чынам, цяжкая прамысловасць працуе, як быццам, не так ужо і дрэнна; і таварышы, якія тут сядзяць, могуць мне сказаць:

— Калі мы даем 28,4 проц. прыросту за 8 месяцаў супроць 8 мес. мінулага года, то ў чым-жа тады справа—IV квартал выканаем і гадавую праграму выканаем і перавыканаем. Няма аб чым размаўляць і няма чаго паднімаць трывогу.

Але калі-б мы так рашылі, мы дапусцілі-б вялікую памылку. Я хацеў-бы спыніцца сёння не толькі на тым, як выканаць заданне IV квартала і выканаць гадавую праграму, але галоўным чынам на тым, **якімі рэзервамі, яшчэ нескарыстанымі, мы ўладаем і як іх мабілізаваць, прывесці ў рух. Вось важнейшае пытанне, якое я хацеў-бы пастаўіць перад вамі.**

РЭЗЕРВЫ ЦЯЖКАЙ ІНДУСТРЫІ

За 1 пяцігоддзе, 1933 год і 6 месяцаў гэтага года наша партыя, наша краіна ўлажыла ў цяжкую прамысловасць 32 млрд. рубл. Уведзена ў эксплаатацыю новых асноўных фондаў на 21.700 млн. руб. Матэрыяльныя каштоўнасці, якія мела цяжкая прамысловасць пачатку сёлетняга года, складаюць 40 млрд. рубл.

Асноўны капітал—30.616 млн., вытворчыя запасы—3.680 млн., завершаная вытворчасць, поўнабрыкаты і гатовыя вырабы — 743 млн. і гатовыя сродкі — 385 млн.

Вось тыя багацці, тыя велізарныя матэрыяльныя каштоўнасці, якія знаходзяцца ў нашых руках.

У цяжкай прамысловасці працуе 6 млн. рабочых, служачых, інжынераў, тэхнікаў.

Гэтыя лічбы яркa ілюструюць поліч перамогі ў справе сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны, якую цвёрдай рукой ажыццяўляла наша ленінская партыя пад кіраўніцтвам натхняльніка і арганізатара нашых перамог тав. Сталіна. У гэтых велізарных каштоўнасцях, у магутным будынку нашай цяжкай індустрыі ўвасоблены творчы энтузіязм рабочых, якія ва ўпартай барацьбе будуюць сацыялізм.

6 млн. работнікаў, 40 млрд. каштоўнасцей, 32 млрд. капіталаўкладанняў у будаўніцтва, увод у эксплаатацыю 21.700 млн. рубляў—вось, таварышы, з чаго нам трэба зыходзіць. Усім трэба ведаць гэтыя лічбы.

Кожны дырэктар, кожны інжынер і тэхнік, кожны партыйны і прафсаюзны работнік павінен ведаць, якія сродкі мае цяжкая прамысловасць. Калі мы гаворым аб нашай рабоце, мы павінны зыходзіць з гэтых велізарнейшых сродкаў, паглядзець уважліва, як мы іх скарыстаем.

Мы павінны адкрыта, па-большэвіцку сказаць, што мы далёка яшчэ не здолелі скарыстаць усіх нашых рэсурсаў. Калі-б мы здолелі як належыць мабілізаваць, мы далі-б куды больш, чым даем зараз. А совецкая краіна мае права ад нас патрабаваць.

Наша краіна, якая ўзводзіць вялікі будынак бяскласавага сацыялістычнага грамадства, якая ажыццяўляе рэканструкцыю на базе навейшай тэхнікі ўсёй народнай гаспадаркі, прад'яўляе велізарныя, безупынна ўзрастаючыя патрабаванні на машыны, на рэчы шырокага спажывання.

Возьмем наша машынабудаўніцтва, металаапрацоўчыя прадпрыемствы. Мы з вамі не раз гордыя заяўлялі аб поспехах нашай аўтатракторнай, нашай авіяцыйнай прамысловасці. Але ўстае пытанне, ці ўсе нашы машынабудаўнічыя заводы загружаны поўнасцю. Я думаю, што не можа быць двух адказаў.

Нашы машынабудаўнічыя заводы (калі ўзяць у цэлым усё машынабудаўніцтва) загружаны не больш чым на 80 проц., а многія з іх значна менш.

Толькі нядаўна, некалькі дзён назад, я вярнуўся з Урала. Быў на Уральскім заводзе цяжкага машынабудаўніцтва. Завод цяпер жыве ўжо вытворчым жыццём, працуе, а ў мінулым годзе, калі я быў на гэтым заводзе, гэта быў хутчэй музей найлепшага абсталявання. Прадукцыі не відаць было.

У гэтым годзе—гэта ўжо працуючы завод. Але ці можна сказаць, што ён цалкам загружан? Кожны раз, калі гэтаму заводу прапануеш стварыць што-небудзь, яшчэ адказваюць: «Трудна, не пасцнімем». А колькі змен на ім працуе? Адна змена. 7 гадз. машына працуе, а ўсе астатнія гадзіны адпачывае.

Возьмем чорную металургію. Мы ў гэтым годзе не без падставы сцвярджаем, што наша чорная металургія рушыла ўперад. У доменных цэхах чорная металургія паказала добрую работу.

Мы маем у гэтым годзе за 8 месяцаў прырост да мінулага года па чыгуну на 51,2 проц., на сталі на 44,5 проц., па пракату на 36,7 проц. Праграма па чыгуну на 1934 год—10 млн. тон. Не падлягае сумненню, што пасля некалькіх год ганебнага адставання гэту праграму мы выканаем. У гэтым годзе мы дамо больш, чым 10 млн. тон чыгуну.

Разбіты ўсе размовы аб тым, што нашы домны не могуць даваць добрых паказальнікаў. Мы маем надрэнныя доменныя цэхі, якія даюць даволі добрыя каэфіцыенты скарыстання агрэгатаў. Вось, напрыклад, Кузнецкі завод даў у жніўні каэфіцыент скарыстання карыснага абёму доменных печаў 1,04, Макеёўскі завод—1,08, Марыупальскі—1,11, Дзержынка—1,17, Сталінскі—1,13. Варашылаўскі завод, які быў доўгі час у прарыве, дае зараз каэфіцыент 1,26. Па ўсіх доменных печах, якія працуюць на коксе, каэфіцыент скарыстання ў сярэднім 1,26. Гэта не так ужо дрэнна. Гэта з усёй пераканальнасцю рэальных фактаў гаворыць аб тым, што пры добрай рабоце, пры правільнай арганізацыі можна атрымаць добрыя рэзультаты. Гэта даказана.

Возьмем Кузнецкі завод. Там справа не зусім ладзілася. Мы накіравалі туды новых людзей на чале з т. Бутэнка. І вось у рэзультаце каэфіцыент скарыстання карыснага абёму домен у жніўні 1,04.

Возьміце нашы мартэнаўскія цэхі. Там непачаты край работы і вялікія рэзервы, але і тут мы маем добрыя ўзоры.

Раней гаварылі, што з вялікіх печаў нельга дабіцца з'ёму сталі з квадратнага метра поду больш чым 33,5 тоны. Больш, гаварылі, не выйдзе.

Бяру вялікую 110-тонную печ. З'ём з квадратнага метра поду ў сярэднім 5 тон: у маі 4,82, у чэрвені—5,18, у ліпені—5,36, у жніўні—5,35. Гэта новы мартэнаўскі цэх на Дзержынцы. А колькі нам даказвалі, што на вялікіх печах нельга так працаваць. Фактамі даказана адваротнае, і ад дасягнутых паказчыкаў ніяк не адкруціцца.

Гавораць, што там, дзе мы выпускаем якасную сталь, трудна працаваць, нельга даваць вялікага з'ёму. Бяру завод «Серп и молот». З'ём з квадр. метра поду па месяцах 1934 г.: студзень—4,22; люты—3,30; красавік—4,51; май—4,25; ліпень—4,67; жнівень—4,77.

Добрая работа цвёрда, без хістанняў, з дня ў дзень, з месяца ў месяц трымае добрыя паказчыкі.

Агрэгаты, печы гатовы служыць совецкай краіне, гатовы даваць многа металу. Што перашкаджае? Дрэнная работа людзей. Машыны не прычым. Машыны, зробленыя на нашых заводах або на капіталістычных заводах за граніцай, гатовы самым добрасумленным чынам працаваць на большэвікоў, а наша справа з вамі не толькі «не перашкаджаць» гэтым машынам добра працаваць **(смех)**, але арганізаваць па-большэвіцку догляд за гэтымі машынамі і правільную эксплаатацыю іх.

Нядарма таварыш **Сталін** гаварыў, што «план гэта жывыя людзі».

Я прывёў рад прыкладаў добрай работы мартэнаўскіх цечаў. Але ў цэлым мартэнаўскія цэхі адстаюць. Што-ж трымае нашы мартэнаўскія печы? Прастоі, так званыя халодныя і гарачыя прастоі, ямы. Гэта значыць, што дрэнна вядуць, паляць печы. Значыць, дрэнна арганізавалі работу.

Возьміце, таварышы, пракат. Па пракату мы адстаем. Пракату не хапае. Што-ж з'ядае наш пракат? З'ядаюць зноў-жа прастоі. Пракатныя станы прастойваюць вельмі многа. Стаяць 22 проц. рабочага часу і больш. А некаторыя ўмудрыліся прастаяць 50 проц. рабочага часу.

Вось Керчанскі завод. Ён з усімі спаборнічае на найбольшыя прастоі, і, трэба аддаць яму справядлівасць, ён «маладзец» у гэтых адносінах, ён прастойвае 58 проц. часу. **(Смех).**

Я не раз пытаў інжынераў, які нармальны прастой. Па-першае, сказалі мне, што такога «нармальнага прастою» не знойдзеш.

Справа залежыць ад людзей, якія працуюць. Па-другое, за граніцай стаяць прыблізна 20-18 проц., а мы, пры нашай некаратнасці і ўсё іншае, можам прыняць 25-27 проц. прастою. Аказваецца, што гэта няверна.

Возьміце завод ім. Камінтэрна. Прастоі пракатных станаў у яго: люты—12 проц., сакавік—14 проц., красавік—14 проц., май—15 проц., чэрвень—13 проц., ліпень—12 проц., жнівень—15 проц. рабочага часу.

Вось завод «Серп и молот»: у студзені—12 проц., у сакавіку—12 проц., у красавіку—11 проц., у маі—14 проц., у чэрвені—12 проц., у ліпені—15 проц., у жніўні—13 проц.

Скажыце, калі ласка, цяпер, чаму войкаўскі завод павінен даваць 58 проц. прастояў? Чаму завод імя Кабакова таксама ўступае ў спаборніцтва на найбольшыя прастоі: 23 проц., 26 проц., 27 проц., 28 проц. Чаму, у чым справа?

Адказ просты: дрэнна, значыць, працуюць.

Глядзіце, таварышы, сколькі нескарыстаных рэзерваў у чорнай металургіі. Нам трэба раўняцца па нашых лепшых работніках, па нашых лепшых заводах у скарыстанні гэтых рэзерваў.

Возьміце электрастанцыі. Яны ідуць на ўзроўні плана, і план у гэтым годзе выконваюць. Але колькі аварый яны даюць, колькі пакут яны прыносяць гэтымі аварыямі шахтам, руднікам і заводам?

А хіба нельга працаваць з меншымі аварыямі і зусім без аварый? **Наша-ж партыя з моманту яе арганізацыі вялікім Леніным працуе безаварыйна (бурныя апладысменты).**

Ленін арганізаваў партыю, і зараз гэта ленінская партыя, кіруемая вялікім Сталіным, вучнем Леніна, працуе без аварый (бурныя апладысменты).

У нас ёсць такія электрастанцыі, якія працуюць без аварый, але вялікая колькасць станцый дае масу аварый. Значыць зноў-жа ў паняўнасці дрэнная работа адных і добрая работа другіх.

Возьмем апал. Мы маем у гэтым годзе прырост здабычы вугалю за 8 месяцаў на 24,8 проц., нафты—18,5 проц., а па Азнафце—35,8 проц.

Ганебна адстае Грознафта, якая дала за 8 месяцаў 72,2 проц. ад мінулага году. А хіба ў апалавай прамысловасці нельга даць большую здабычу?

Возьміце хоць-бы Данбас, які працуе надрэнна, але ў апошнія месяцы пачаў хістацца. У студзені ў Данбасе працавала 75,6 з агульнай колькасці ўсіх наяўных урубавых машын, у ліпені—78,3 проц.; адбойныя малаткі: у студзені—60,3 проц., у ліпені—59,6 проц. усяго ліку наяўных малаткоў. Паглядзіце, якая велізарная колькасць гэтых машын бяздзейнічае.

У чым-жа справа? Справа зноў-жа ў арганізацыі працы. Як след возьмуцца за справу—выходзіць, не возьмуцца як след—правальваюцца і крычаць, што другія падводзяць.

Возьміце нашу нафтавую прамысловасць. Колькі крыку, колькі шуму, што труб няма, таго, другога, трэцяга. А паглядзіце, як нафтавікі скарыстоўваюць свае варштаты. Прадукцыйны час, які затрачваецца на чыстае бурэнне і паглыбленне нафтавых прабоін, у студзені 1934 г. па Азнафце—46,7 проц., па Грознафце ў чэрвені—51,1 проц.

Ясная справа, што нафтавую прамысловасць трэба забяспечыць як мага лепш, трэба даць ёй вельмі добрыя трубы, трубныя заводы павінны рашуча палепшыць работу. Я быў вымушан абявіць вымову за зрыў заказа нафтавікоў дырэктару Марыупальскага завода тав. Радзіну, дырэктару Таганрогскага завода тав. Калеснікаву і тэхнічнаму дырэктару Трубасталі інжынеру Шпельтэ. Але тое, што дае нафтавай прамысловасці, трэба скарыстаць беражліва, а не абыходзіцца па-варварску з абсталяваннем.

Гаворачы аб нескарыстаных рэзервах і аб адстаючых галінах нашай цяжкай прамысловасці, мы павінны асобна сказаць аб вырабе рэчаў шырокага спажывання, асабліва аб вытворчасці металічных вырабаў шырокага спажывання. Гэта адна з самых адсталых і запушчаных галін нашай работы. У цэлым па цяжкай прамысловасці план 1934 года мы выконваем, а па метызах шырспажыву мы выконваем толькі 75-80 проц.

ШЭСЦЬ УМОЎ тав. СТАЛІНА—ШЛЯХ ДА ПЕРАМОГІ

Можа ўстаць такое пытанне: якое-ж рашэнне мы прымем на гэтай нарадзе, якую «платформу», якія шляхі намецім? Я думаю, што ніякай «платформы» выпрацоўваць не прыдзецца. Калі ў 1931 годзе выкананне нашай вытворчай праграмы ішло кепска, у будынку ЦК нашай партыі была склікана нарада гаспадарнікаў. На гэтай нарадзе таварыш Сталін сказаў сваю гістарычную прамову, сфармуляваўшы свае «6 умоў». Гэтыя 6 умоў былі нашай баявой праграмай пераможнага руху наперад. Ці можам мы сёння сказаць, што гэтыя 6 умоў цалкам намі выкананы? Ні ў якім разе.

Аб чым тады таварыш Сталін гаварыў? — «Нельга ўжо разлічваць больш па-старому на самацёк рабочай сілы. Каб забяспечыць прамысловасць рабочай сілай, трэба яе набіраць арганізаваным парадкам, трэба механізаваць працу».

Ідучы па гэтаму шляху, мы рабочай сілай слабе забяспечылі. Сёння нам скардзіцца на тое, што нехапае рабочых, не прыходзіцца. Але ці дабіліся мы рашучых поспехаў у справе механізацыі працаёмкіх работ?

Таварыш Сталін гаварыў: «Думаць, што можна абыйсціся без механізацыі пры нашых тэмпах работы і маштабах вытворчасці—значыць спадзявацца на тое, што можна вычарпаць мора лыжкай».

Гаворачы аб механізацыі, таварыш Сталін тут-жа папярэджаў: «Гэта не значыць, вядома, што трэба, чібы, закінуць ручную працу. Наадварот, ручная праца доўга яшчэ будзе адыгрываць у вытворчасці сур'ёзнейшую ролю».

Зразумела, з 1931 года ў справе механізацыі мы шагнулі далёка наперад, але гаварыць, што мы ўжо механізавалі як след нашы работы ў будаўніцтве, не прыходзіцца.

А як стаіць справа на нашых пабудовах? Вось, напрыклад, на Тагіле будуецца велізарны вагонабудаўнічы завод, завод, роўнага якому няма нават за граніцай. На пабудове гэтага гіганта праробілена немалая работа, але агромная работа яшчэ наперадзе.

Як-жа там механізавана праца? Вось наглядны прыклад. Ідзем па будоўлі — праводзіцца велізарны тунель у скалістым грунце. Стаяць рабочыя з кіркамі і лапатамі. На маё запытанне, чаму не прымяняюцца ўарыўныя работы, адказваюць: бачыце, грунт такі порысты, што не атрымліваецца ўзрываў. Я не зусім паверыў гэтай заяве і загадаў зрабіць узрыў пры мне. У гадзіну ночы зрабілі ўзрыў і атрымалі агромнае абрушэнне — вызваліўся ад земляных работ значная колькасць рабочых.

Наша машынабудаўніцтва памацнела і развілося. Яно можа і павінна ўзброіць будаўніцтва механізмамі, рашуча павялічыўшы іх выпуск і павысіўшы якасць. Але трэба дабіцца таго, каб на ўсіх пабудовах навучыліся як след скарыстоўваць механізмы, поўнасцю загружалі іх. З няўменнем механізаваць работы, з бязрукасцю, з супраціўленнем механізацыі, якое мае месца на многіх пабудовах, трэба рашуча пакончыць.

«ЛІКВІДАВАЦЬ ЦЯКУЧАСЦЬ РАБОЧАЙ СІЛЫ, ЗНІШЧЫЦЬ УРАЎНІЛАЎКУ, ПРАВІЛЬНА АРГАНІЗАВАЦЬ ЗАРПЛАТУ, ПАЛЕПШЫЦЬ БЫТАВЫЯ ЎМОВЫ РАБОЧЫХ—ТАКАВА ЗАДАЧА»—гаварыў Сталін.

Як у нас цяпер? Цяпер у нас становішча лепшае ў параўнанні з 1931 годам, але яшчэ далёка не ўсё зроблена. Лявацкая ўраўнілаўка не дабіта.

Нам трэба самым рашучым чынам пакончыць з сістэмай так званай «сярэдняй зарплаты». Гэта агідная абязлічка, якая нічога не гаворыць, і той, хто прапануе «сярэднюю зарплату» і хоча на гэтай аснове арганізаваць працу, той рашуча нічога не разумее ў рэчаіснасці і палітыцы **(бурныя апладысменты).**

Трэба выканаць цалкам і поўнасцю другую ўмову, пастаўленую таварышом Сталіным — знішчыць ураўнілаўку і правільна арганізаваць зарплату. Гэта будзе магутнай зброяй у нашых руках у барацьбе за мабілізацыю рэзерваў цяжкай прамысловасці.

Таварыш Сталін гаварыў аб тым, што трэба сістэматычна паляпшаць бытавыя ўмовы рабочых. Як у нас стаіць справа ў гэтых адносінах? Вельмі часта гавораць: што зробіш, нехапае капіталаўкладанняў, нехапае жыллоплошчы. А ці ведаем мы, якая жыллёвая плошча ў нас ёсць зараз?

К пачатку 1928 г. яна складала 8 млн. кв. метр., а к пачатку 1934 года—20 млн. кв. метр. Вы думаеце, што гэта дарам далося? У жыллёвае будаўніцтва ўкладзена больш 4 млрд. рублёў. А як утрымліваюцца гэтыя дамы? У некаторых месцах справа даходзіць да ганебных фактаў.

А рабочы справядліва патрабуе задавалення яго матэрыяльна-бытавых запатрабаванняў. Калі гэтага мы не будзем рабіць, ён будзе пераходзіць з месца на месца і шукаць, дзе яму дадуць лепшую кватэру.

Трэба стварыць такія ўмовы рабочым, каб яны працавалі з высокаю прадукцыйнасцю. Мы пабудавалі найлепшыя заводы, цэхі, агрэгаты. Калі яны не будуць абслугоўвацца як належыць, мы выведзем іх у самым бліжэйшым часе з строю.

Я цэлы месяц ездзіў па Уралу. На некаторых заводах разбілі палісаднікі, пасадзілі кветкі і гэтым абмежаваліся. Кветкі — вельмі добрая рэч, але, таварышы, калі пры гэтым і ўвесь завод у добрым стане, чэсць і слава вам, але калі кветкамі хочаце «очки нам втирать», у цэхах у вас беспарадак і гразь — гэты нумар не пройдзе.

Часам барацьбу за чыстату вядуць так: бяруць сцірку і пачынаюць чысціць. Чысцяць машыны, мыюць падлогу і т. п., але паглядзіце, ці ёсць масла ў масёнцы, ці не. Чысціць машыны трэба, трэба, каб яны бліскалі, але ні на мінутку не забывайце змазаць машыну — гэта перш за ўсё!

Мала яшчэ ў нас культурнасці, вяліка яшчэ культурная адсталасць, старыя павыкі. Велізарная маса рабочых із вёскі прышла на пабудову, сёння яны — эксплаатацыйнікі. Прышлі з тымі навыкамі і звычкамі, якія мелі дома. Гэта верна. Але ці будзем мы простымі цасіўнымі сведкамі гэтага, ці разгорнем наступленне супроць гэтай некультурнасці і пацягнем наперад да культурнай работы і культурнага быту?

Тав. Сталін гаварыў, што «нельга больш цярпець абязлічкі ў вытворчасці. Каб пазбавіцца ад гэтага зла, трэба па-новаму арганізаваць працу, трэба расставіць сілы такім чынам, каб кожная група рабочых адказвала за работу, за механізмы, за варштаты, за якасць работы.

Мы, бадай, фармальна абязлічку знішчылі. Цяпер да кожнага агрэгата прымацавана пэўная асоба, калі не ўсюды, то ў большасці выпадкаў. Але гэтым справа не канчаецца. Калі да данага агрэгата, данага варштата прымацован, дапусцім Іваноў, дык гэта зусім не значыць, што абязлічка знішчана. Абязлічка знішчана толькі тады, калі Іваноў сапраўды добра даглядае свой варштат, трымае яго ў чыстаце, прыводзіць у парадак, асвоіў на ім работу і ён на справе адказвае за гэты варштат, — вось тады абязлічка знішчана **па сутнасці**, а не фармальна. А калі гэтага не зроблена, абязлічка ўсё яшчэ трыумфуе.

Тав. Сталін гаварыў: «Каб падняць цяперашнія тэмпы і маштабы вытворчасці, трэба дабіцца таго, каб у рабочага класа была свая ўласная вытворча-тэхнічная інтэлігенцыя».

Мы яе стварылі, мы зараз маем сваю пролетарскую тэхнічную інтэлігенцыю, — гэта несумненна. Мы маем дзесяткі тысяч новых інжынераў — гэта наша гордасць. Працуюць яны надрэнна. Я пералічаў некаторых нашых учарашніх і сённешніх комсамольцаў-інжынераў. Да іх можна дадаць імёны тысячы партыйных і беспартыйных інжынераў і тэхнікаў, якія дабіваюцца немалых поспехаў. Але мы не можам на гэтым супакоіцца. Тое, што гаварыў тав. Сталін аб стварэнні, вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі рабочага класа, трэба палкам і поўнасцю ператварыць у жыццё.

Тав. Сталін гаварыў аб старых інжынерных кадрах. Ён гаварыў тады, што намецілся пералом у адносінах актыўнага ўдзелу старога інжынерства ў соцыялістычным будаўніцтве. Цяпер мы можам сказаць, што старое інжынерства з намі. Абавязкам работнікаў прамысловасці з'яўляецца шырокае скарыстанне творчай ініцыятывы інжынерных сіл.

Тав. Сталін гаварыў: «Каб забяспечыць далейшае разгортванне прамысловасці і сельскай гаспадаркі, трэба дабіцца таго, каб пусціць у справу новыя крыніцы накаплення, ліквідаваць безгаспадарчасць, укараніць гаспадарчы разрахунак, знізіць сабекошт і падняць унутрыпрамысловае накапленне».

Як у нас у гэтых адносінах стаіць справа? Трэба сказаць, што да мінулага года мы вельмі энергічна павышалі сабекошт. У гэтым годзе знізілі. Машынабудаўніцтва дае накапленні. Нават чорная металургія і вугаль сталі зніжаць сабекошт. Гэта ўсё верна. Але калі мы расшавелім тыя рэзервы, аб якіх я гаварыў, калі мы будзем працаваць лепш, чым працуем, калі мы будзем выдаткоўваць матэрыялы эканомней, чым мы выдаткоўваем, тады накапленняў у нас будзе непараўнана больш.

Трэба працаваць па-гаспадарчаму, эканомна, з разлікам, трэба накапляць сродкі і будаваць далей. Мы можам даць куды больш накаплення, чым мы даем сёння.

Тав. Сталін патрабаваў «па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць».

Тав. Сталін патрабаваў, каб «наш гаспадарчыя кіраўнікі кіравалі прадпрыемствамі не «наогул», не «з павэтра», а канкрэтна, прадметна, каб яны падыходзілі да кожнага пытання не з пункту гледжання агульнай балбатні, а строга дзелавым чынам, каб яны не замажоўваліся папяровай адпіскай або агульнымі фразамі і лозунгамі, а уваходзілі ў тэхніку справы, уваходзілі ў дэталі справы, у «дробязі», бо з «дробязей» будуюцца цяпер вялікія справы».

Ці трэба ставіць гэта пытанне і сёння, ці можа яно ўжо вырашана? Па-моему, трэба ставіць яго з усёй астратой. Так, як мы кіруем зараз (гэта асабліва адносіцца да многіх нашых галаўкаў і трастаў, таксама да многіх дырэктароў), так кіраваць нельга.

Дырэктар завода, калі ён добры дырэктар (а ў нас такіх дырэктароў ёсць ужо даволі многа), павінен добра ведаць кожны куток свайго завода. Ён павінен ведаць, па крайняй меры ўвесь камандны склад да брыгадзіраў уключна, лепшых ударнікаў: ведаць, чым ён жыве, як працуе. Калі ён гэтага не ведае, калі ён у вытворчасці не разбіраецца, не можа ён быць добрым дырэктарам. Справа асваення тэхнікі несумненна прасунулася наперад, і рэзультат гэтага ў гэтым годзе мы маем. Але догляд за машынамі, за механізмамі і агрэгатамі проста-такі варварскі. Калі догляд не палепшым, мы загубім машыну. Усяму гэтаму дырэктары прадпрыемстваў павінны аддаваць самую пільную ўвагу.

А як кіруюць нашы трэсты? І яны стараюцца прайсці хутчэй мяма агіднасцей, стараюцца ці скочыць міма.

Трэба ва многім змяніць кіраўніцтва і нашым галаўкам. Галаўкам павінен кіраваць па-сапраўднаму. Калі прадпрыемствы патрабуюць чаго-небудзь ад яго, ён павінен дэтальна ўсё праверыць, даць такую праграму свайму прадпрыемству, каб яна была напружанай, каб былі скарыстаны ўсе вытворчыя магутнасці прадпрыемства і прымусіць гэту праграму выканаць.

Калі-б мы ўсе лепш кіравалі, былі-б лепшыя рэзультаты. Я гэта кажу не для таго, каб проста людзей шальмаваць, а каб шальмаваць і дыскрэдытаваць нашы недахопы, ускрыць іх, паказаць іх вам, каб заўтра мы дабіліся іх устранення **(апладысменты)** і каб наша цяжкая прамысловасць, якой наша партыя, наш Сталін аддае такую велізарную увагу, як належыць арганізавала вытворчасць, капітальнае будаўніцтва і магла прыйсці да Сталіна і сказаць яму: усе твае ўказанні, якія даў ты ў сваіх 6 умовах і на XVII з'ездзе, мы, работнікі цяжкай прамысловасці — і партыйныя і беспартыйныя — з усёй энергіяй, па-большэвіцку заводзім у жыццё і дабіваемся ганаровага права далажыць табе: цяжкая прамысловасць упэўнена крочыць наперад. Вось чаго я хачу, калі бяру пад крытыку нашу работу **(бурныя апладысменты).**

Перамогі мы можам дабіцца пры адной абавязковай умове — калі ўсе нашы гаспадарнікі, перш за ўсё і раней за ўсё, будуць добрымі партыйцамі — я кажу аб членах партыі — а нашы беспартыйныя гаспадарнікі і інжынеры будуць самымі добрасумленнымі і адданымі радзіме работнікамі.

Таварышы, калі мы з вамі па большэвіцку возьмемся за справу, мы пераможна завершым гэты год і заявім нашай партыі і XVII з'езду Саветаў аб тым, што праграма 1934 года цяжкай прамысловасцю ў цэлым **выканана.**

У 3-м годзе 2-й пяцігодкі ў цяжкай прамысловасці новыя, вялікія і адказныя задачы, але ў яе ёсць магутная 6-мільённая армія, і гэта армія павінна быць у авангардзе разгорнутага сацыялістычнага наступлення па ўсяму фронту. Даю вам прыказанне ад Цэнтральнага Камітэта нашай комуністычнай партыі большэвікоў і Совета Народных Камісараў Совецкага Саюза **(бурныя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю).**

АСТАЛІСЯ РАШАЮЧЫЯ ДНІ

ГЕРАЎКЕР

Намеснік загатчыка с.-г. аддзелам ЦК КП(б)Б

Не гледзячы на некаторае палепшэнне, якое наглядаецца ў рабоце апарата «Заготжывёла», усё-ж ён яшчэ не стаў сапраўдным арганізатарам мас на выкананне плана мясапаставак. Аб гэтым ярка падкрэслена ў рашэнні чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б. Пленум адзначыў, што да гэтага часу яшчэ загатоўчыя арганізацыі (Заготжывёла) з'яўляюцца ў лепшым выпадку пасіўнымі прыёмшчыкамі паступаючай жывёлы, але ні ў якай меры не арганізатарамі загатовак мяса і актыўнымі барацьбітамі за выкананне мясапаставак».

Гэта ўказанне пленума органы «Заготжывёлы» не ўлічылі ў сваёй практычнай рабоце. Яны папрэжнейшаму астаюцца ў большай сваёй масе толькі прыёмшчыкамі жывёлы, ні ў якай меры не арганізуючы масавай работы вакол пытання выканання плана мясазагатовак.

Пасля пастаноў пленума частка раёнаў вядрэнна ўзялася за выкананне рашэнняў ЦК па мясазагатоўках. Так, **Уздзенскі** раён (сакратар РК **Манюк**) выканаў план трэцяга квартала на 143 проц., **Стара-Дарожскі** раён (сакратар РК **Шалапёнак**) — на 104,3 проц., **Дзяржынскі раён** (сакратар РК **Дамброўскі**)—на 102,4 проц., **Дрысенскі** раён (сакратар РК **Бурачэўскі**)—на 102,3 проц.

Але адначасова з перадавымі ёсць і такія раёны, дзе мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі недаацэньваюць гэту справу, папартыйстычнаму адносяцца да выканання плана мясапаставак.

Да гэтага часу там не ўзяліся за баявое выкананне рашэнняў чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б і ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б) аб мясапастаўках, не гледзячы на тое, што да сканчэння трэцяга квартала асталіся лічаныя дні.

Бешанковіцкі раён (сакратар РК, **Каждан**, кіраўнік канторы Заготжывёла **Скобелеў**) на 15 верасня г.г. выканаў план мясаздачы на 30,9 проц., **Нараўлянскі** раён (сакратар РК **Казачонак**, кіраўнік «Заготжывёлы» **Волкаў**) план мясаздачы выканаў на 31,6 проц., **Хойніцкі** раён (сакратар РК **Мар'янаў**, кіраўнік «Заготжывёлы» **Ліўшыц**) план выканаў на 32,9 проц. Такое-ж становішча мы наглядаем у **Бялыніцкім** раёне — 34,7 проц., **Чырвонапольскім**—34,9 проц., **Лепельскім, Веткаўскім, Лёзненскім, Магілеўскім, Сенненскім Гомельскім** і іншых раёнах, дзе таксама план мясаздачы трэцяга квартала выкананы не больш чым на 40 проц.

У выніку дрэннай работы раду раёнаў план мясапаставак трэцяга квартала па рэспубліцы выкананы толькі на 60 проц., а план адгрузкі Ленінграду на 31 проц. Пры тым трэба адзначыць, што асабліва адстае аднаасобны сектар. Гэта сведчыць, што барацьбу за мясапастаўкі сярод аднаасобнага сектара пусцілі на самацёк.

Асабліва неабходна падкрэсліць недапушчальнае адставанне раду соўгасаў па мясапастаўках. Соўгас «Веснаво», Глускага раёна (дырэктар соўгаса Кухарэнка, начальнік палітаддзела т. Крывабокаў), выканаў план мясаздачы трэцяга квартала толькі на 7 проц. Рад іншых соўгасаў таксама зрываюць выкананне ўстаноўленых месячных планаў мясаздачы.

Такое становішча з мясапастаўкам, якое мы маем зараз, далёка не цярпіма. Неабходна, каб нашы раённыя кіраўнікі зразумелі, што барацьба за выкананне плана мясапаставак з'яўляецца не менш важнай задачай, чым барацьба за хлебапастаўкі.

Дні, якія асталіся да канца трэцяга квартала, трэба зрабіць баявымі днямі па выкананню квартальнага плана мясапаставак, ліквідацыі недоімак за першае паўгоддзе і выкананне плана адгрузкі мяса Ленінграду.

Трэба ліквідаваць адставанне аднаасобнага сектара, арганізаваць калектыўную здачу мяса як сярод аднаасобнікаў, так і калгаснікаў, арганізаваць соцыялістычнае спаборніцтва паміж вёскамі, калгасамі, сельсоветамі, соўгасамі і раёнамі па поўнае і своечасовае выкананне плана мясапаставак. Гэта павінна з'явіцца гонарам кожнага раёна, соўгаса, калгаса, калгасніка і аднаасобніка.

ДАПАМОГА... ДАКЛАДНЫМІ ЗАПІСКАМІ

Самым буйным у Бярэзінскім сплаўучастку з'яўляецца Ухвальскі падучастак. Ён у гэтым годзе павінен сплавіць **110 тыс.** кубаметраў драўніны.

Для выканання вытворчай праграмы Ухвальскі падучастак мае ўсе магчымасці. Гэта даказаў лепшы сплаўшчык нашай краіны **Сцяпан Грыгор'евіч Туфар**, які нядаўна наведзіў падучастак і азнаёміўся са становішчам сплаву.

Аднак, гэтых магчымасцей не скарысталі кіраўнікі Бярэзінскага сплаўучастка **Марголін**, загатчык Ухвальскага падучастка **Шмуклер**. Яны пачалі мазлявы сплаў, думаючы, што незвязаны лес па цячэнню рэчкі сам паплыве. Спіхнулі ў ваду **23.900** кубаметраў лесаматэрыялаў. Але без рабочых гэты лесаматэрыял далёка не паплыў. Рэчкі аказаліся загружанымі бярвеннем.

На берагах рэк **Бобр і Можа** ляжыць **25 тыс.** кубаметраў будаўнічага матэрыялу і каля **8 тыс.** раўметраў дроў. Усё гэта патрэбна звязаць і накіраваць да канчатковага пункта — рэкі **Бярэзіна**. Для гэтага патрэбна **500** рабочых, а ёсць толькі **160**.

Толькі цяпер Марголін і Шмуклер зразумелі, што для малявога сплаву патрэбны людзі. Не разумеюць яны таго, што толькі брыгадным метадам работы можна забяспечыць паспяховае выкананне плана сплаву. Ні адной брыгады на сплаве няма, няма здзельшчыны. Сплаўшчыкі працуюць падзённа.

Нядаўна на дапамогу ў ліквідацыі прарыву прыехалі ўпаўнаважаныя ад Лесбела Каган і ад Бабруйскай сплаўканторы **Лубгон**. Але яны замест практычнай дапамогі толькі пішуць **дакладныя запіскі** ў Лесбел аб пагражаючым становішчы са сплавам па Ухвальскаму ўчастку.

А. М.

ЗАКУПКА ХЛЕБА

СКАРЫСТАЦЬ ВОПЫТ МЕНСКА

РАЗГОРТВАННЕМ СОЦСПАБОРНІЦТВА ЎСІЛІМ ПРЫТОК ХЛЕБА НА ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПУНКТЫ

ПАШЫРЫЦЬ КАШТОЎНУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ

Пачын партыйнай арганізацыі завода «Комунар» — каштоўная і важная справа.

Заводы, фабрыкі, установы, шэфы могуць і павінны аказаць дапамогу ў справе правядзення дзяржаўных закупак хлеба ў падшэфных сельсоветах і калгасах.

Вялікую ролю могуць адыграць пісьмы рабочых сваім сваякам і знаёмым па вёсцы, соцыялістычнае спаборніцтва паміж рабочымі і калгаснікамі, масавая работа шэфработнікаў.

Пачын партыйнай арганізацыі і рабочых завода «Комунар» павінен быць падхоплен і перанесен на другія прадпрыемствы. Не павінна быць ні аднаго прадпрыемства, рабочага калектыва, які-б не прыняў актыўнага ўдзелу, не разгарнуў масавай работы вакол закупак хлеба.

Парткомы, парторгі павінны пытанне аб дзяржаўных закупках хлеба прапрацаваць на брыгадах, цэхавых сходах рабочых і вызначыць канкрэтныя меры, якія-б стымулявалі паспяховае ажыццяўленне гэтай важнейшай задачы.

Пастанова нарады партыйных і комсамольскіх цэх-арганізатараў машынабудаўнічага завода „Комунар"

Адзначаючы ўсю аграмадную важнасць паспяховага правядзення дзяржаўных закупак хлеба, нарада лічыць, што ці адзін рабочы нашага завода, а асабліва рабочыя, якія маюць сувязь з вёскай, не могуць стаяць у баку ад актыўнага ўдзелу ў разгортванні дзяржаўных закупак хлеба.

Трэба памятаць словы тав. **Гікало**, што «хлебазакупкі з'яўляюцца праверкай нашага ўмення арганізаваць масы на барацьбу за выкананне важнейшых дзяржаўных заданняў».

— Пытанне аб хлебазакупках шырока абгаварыць на партыйных групах, цэхавых, брыгадных і заводскіх сходах.

Комуністы, комсамольцы, якія маюць сувязь з вёскай, павінны шляхам пасылкі пісем растлумачыць сваім сваякам, знаёмым велізарнейшае значэнне паспяховага правядзення дзяржаўных закупак хлеба.

Просім кожнага рабочага нашага завода, які мае знаёмых або сваякоў у вёсцы, пры перапісцы з імі браць на сябе канкрэтныя абавязацельствы па палепшэнню вытворчых працэсаў на заводзе і адначасова дабівацца сустрэчных абавязацельстваў з боку калгаснікаў і аднаасобнікаў па продажу дзяржаве сваіх лішкаў хлеба.

Даручыць партыйнаму камітэту завода вылучыць **праз шэфкамісію трох таварышоў і паслаць іх у падшэфны сельсавет для правядзення масавай работы і дапамогі ў закупках хлеба.**

Па даручэнню партыйных і комсамольскіх цэхавых арганізатараў

Сакратар парткома ГУРАЛІС.

САБАТАЖНІКІ ХЛЕБАЗАКУПАК

Толькі ў двух сельсоветах Сенненскага раёна—**Немайцянскім** і **Раснянскім**—разгарнулася масава-палітычная работа вакол пытання дзяржаўнага гандлю хлебам. З агульнай колькасці 77 тон закупленага хлеба ў раёне, пераважная часта падае іменна на гэтыя два сельсоветы.

Кааператыўныя арганізацыі раёна зусім бяздзейнічаюць. Так, сельпо **Алексініцкага, Застадольскага, Хатчэнскага, Падворыцкага** сельсоветаў да закупак хлеба нават не прыступалі. Райсаюз таксама да правядзення гэтай важнейшай кампаніі не падрыхтаваўся. У крамах сельпо тавараў для стымулявання закупак няма.

У першыя-ж дні работы па разгортванню закупак хлеба выяўляецца недахват складачных памяшканняў, хоць фактычна склады для ссыпкі зярна ёсць, але яны не падрыхтаваны.

Старшыня райсаюза **Бескін** лічыць, што гэта наогул не яго справа, што закупкай павінен займацца ўпаўнаважаны. Бескін нават не рэагаваў на той факт, што загатчык раснянскага сельпо Ясюкевіч не з'явіўся на сход калгаснікаў калгаса Расна, на якім рашылі прадаць дзяржаве 18 тон зярна.

Яшчэ горш працуе **Заготзярно** (загатчык **Танхельсон**). Па яго заказу было вернута са станцыі Вятна тры тоны гароху, прывезенага для продажу дзяржаве. **Танхельсон гайшоў да таго, што пазваніў старшыні Немайцянскага сельсавета, каб калгасы не везлі зярно, бо прымаць усёроўна няма куды.**

Бескін і Танхельсон наогул не лічаць сваім абавязкам арганізоўваць закупку хлеба і стаяць у якасці тэхнічных прыёмшчыкаў, але і гэта яны таксама дрэнна выконваюць. Сельсоветы, у якія выязджалі Бескін і Танхельсон, да гэтага часу не прадалі дзяржаве ні аднаго кілограма зярна.

Першыя дні работы па закупцы хлеба ў Сенненскім раёне дазваляюць зрабіць вывад, што даверыць **гэты важнейшы ўчастак работы Бескіну і Танхельсону, значыць праваліць справу ў самым яе зародку.**

МІКУЦКІ.

МЕНСКІ РАЁН УМЕЛА АРГАНІЗАВАЎ ХЛЕБАЗАКУПКІ

Чырвоны абоз са сцягамі і плакатамі спыніўся каля будынка менскага райсаюза.

Два маладыя хлапцы прышлі паведаміць райсаюз, што прызыўнікі Грычанскага сельсавета, у адзнаку прыёму ў Чырвоную армію, даставілі 20 тон хлеба для продажу дзяржаве.

Разгортванне масавай работы з калгаснай моладдзю — адзін з метадаў арганізацыі хлебазакупак па Менскаму раёну.

Прыезд наркома абароны тав. **Варашылава** ў Менск кааператыўныя арганізацыі адзначылі чырвонымі абозамі з хлебам.

Вялікі ўздым калгасных мас, выкліканы прыездам наркома, быў замацован далейшай масава-арганізатарскай работай. Былі праведзены сходы па калгасных брыгадах і дзесяцідворках. Выступаўшыя калгаснікі выклікалі адзін другога на спаборніцтва па продажу хлеба.

На гэтых сходах праўленні калгасаў падавалі заяўкі на набыццё грузавых машын за грошы, атрыманыя ад продажу хлеба дзяржаве.

Актыў сельсоветаў, селью, калгасаў, настаўнікі, комсамольцы растлумачвалі калгаснікам выгады хлебазакупак, абыходзілі хаты, вялі агітацыю ў брыгадах.

Некаторыя калгасы— імя ДПУ, імя Фалько, імя Дзержынскага—прадалі дзяржаве ад 6 да 15 тон хлеба кожны.

У Нова-Дворскім сельсавеце ў хлебазакупкі ўцягнуты аднаасобнікі. У сельсавеце ёсць шмат аднаасобных двароў, якія прадалі па 100—150 кілограм. Мясцовыя актывісты абыходзілі хаты сялян і вялі з імі гутаркі.

Менскі райсаюз даў для стымулявання хлебазакупак рад дэфіцытных тавараў: веласіпеды, гадзіннікі, паляўнічыя стрэльбы, боты, валенкі, гонты, цвікі, эмаляваную пасуду, шкло, махорку. Упрытожаныя лозунгамі і плакатамі грузавікі і фургоны раз'язджаюць з таварамі па калгасах і вёсках.

Калгасы імя ДПУ, імя Дзержынскага атрымалі за праданы хлеб веласіпеды і цэмент для будаўніцтва.

Да 21 верасня па Менскаму раёну закуплена каля 150 тон хлеба. Найбольшую колькасць хлеба закупілі: **Калодзішчанскае** сельпо — 55 тон, Астрашыцка-гарадзецкае (старшыня **Кадзінковіч**)—каля 40 тон. Прыгараднае сельпо (старшыня **Яноўскі**)—36 тон і т. д.

Ф. Е.

ВЕСТКІ АБ ЗАКУПКАХ ХЛЕБА

Калгасы і калгаснікі калгасаў «САВІЧЫ», «КАСТРЫЧНІК», «ЧЫРВОНАЯ НІВА», «ЧЫРВОНЫ ПРАЦАЎНІК», Брагінскага раёна прадалі дзяржаве 135 тон зярна.

ХІЛІМОНАЎ.

Сайкаўскі сельсавет, Менскага раёна, на 23 верасня прадаў дзяржаве 70 тон зярна.

Старшыня сельсавета МАРКМАН.

Пісьмы РАБОЧЫХ і КАЛГАСНІКАЎ

НАРКАМЗЕМУ БССР ТАВ. БЕНЕКУ.

СПЕКУЛЯНТЫ НА МЕНСКАЙ КОННАЙ БАЗЕ

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА).

На менскай міжраённай коннай базе працуюць былыя буйныя спекулянты **Лейба Каплан і Абрам Коцін.**

13 жніўня яны купілі на конскім рынку ў пр-на Камлюка (Міхапавічы) каня за 1.100 руб., а квітанцыю выдалі на 1.200 руб. Такім парадкам яны «ўтаргавалі» сабе 100 руб. Такіх прыкладаў можна прывесці шмат.

Падаваў я заяву загатчыку менскай коннай базы т. Фурманаву, але ніякіх мер да спекулянтаў не прынята. Больш таго, даведаўшыся, што я іх выкрываю, яны заявілі майму бацьку: «Скажы свайму сыну, калі ён не кіне працаваць на «нашай» базе, вы яго знойдзеце хутка ў гліне».

Наркамзем не сочыць за работай гэтай базы і не клапоціцца аб забеспячэнні яе совецкімі людзьмі.

МІТКЕВІЧ.

НАРКОМАСВЕТЫ БССР ТАВ. ЧАРНУШЭВІЧУ

ГАЛАВАЦЯПЫ ЗАКРЫЛІ ДЗВЕ ШКОЛЫ

(ПІСЬМО НАМ. НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТАДДЗЕЛА ЧАВУСКАЙ МТС).

Па загаду загатчыка Чавускага райана тав. **Шаўрука** закрылі дзве школы — адну ў Галавенчыцкім сельсавеце пры калгасе «Заветы Ільіча», другую ў калгасе «Валажаніна», Антонаўскага сельсавета.

Вучні абодвух школ пыкмушаны зараз хадзіць у школу за 4 кілометры.

РК КП(б)Б і РВК аб гэтым добра ведаюць, але ніякіх мер не прымаюць.

МАРОЗАЎ.

СТАРШЫНІ АСІПОВІЦКАГА РВК ТАВ. МЛОДЗКУ.

З ДОМА СОЦКУЛЬТУРЫ ЗРАБІЛІ СКЛАД

(ПІСЬМО ЗАГАДЧЫКА ДОМА СОЦКУЛЬТУРЫ)

У самы разгар хлебазадачы ў Асіповіцкім «Заготзярно» не хапіла складаў для ссыпкі зярна. Па дазволу сакратара РК КП(б)Б т. Новікава і старшыні РВК т. Млодзка часова ссыпалі збожжа ў дом соцкультуры.

З часу ссыпкі збожжа (18 жніўня) прайшло ўжо шмат часу. Памяшканне дома соцкультуры яшчэ занята збожжам і цяпер.

ШЫШКАВЕЦ.

Па слядах пісем

„ЧАМУ БЫЎ ЗВОЛЕН ГАЛОЎНЫ ІНЖЫНЕР БЕЛЖЫЛСАЮЗА Т. ГЕРЧЫКАЎ"

Пад такім загалоўкам у «Звяздзе» 21 жніўня было змешчана пісьмо галоўнага інжынера БЖС тав. Герчыкава і матэрыял нашых спецкораў, якія расследвалі пісьмо.

3 верасня мы змясцілі пастанову ЦП саюза гарадскіх прадпрыемстваў АБ АДНАЎЛЕННІ ГЕРЧЫКАВА НА РАБОЦЕ.

Гэтыя матэрыялы 19 верасня разгледжаны таксама і на бюро Менгаркома КП(б)Б. Сігналы «Звязды» прызнаны зусім правільнымі і своечасовымі.

«Кіраўніцтва Белжылсаюза, — гаворыцца ў пастанове бюро гаркома, —замест сапраўднага разгортвання работ па рамонту жыллёвага фонду, займалася адміністраваннем, узначальвала важым самакрытыкі, сямейнасць і бездакназнасць у рабоце».

Бюро Менгаркома КП(б)Б пастанавіла:

1. Для прыцягнення да партыйнай адказнасці былога кіраўніка Белжылсаюза тав. ЕЎГЕЕВА справу перадаць партарганізацыі па месцу яго работы.

2. Парторгу Белжылсаюза тав. КУРАПАТАВУ за нерэагаванне на сігналы газет і прыміранцтва да фактаў зажыму самакрытыкі АБВЯСЦІЦЬ ВЫМОВУ.

3. Старшыню Менгаржылсаюза тав. ТРУСКІНА, як няспраўшагося з работай, адклікаць у распараджэнне гаркома. Прыняць да ведама, што новапрызначаны старшыня Горжылсаюза тав. АСТРОЎСКІ прыступіў да работы.

4. Даручыць т.т. Шулькіну і Варно праверыць работу Менскай рамонтна-будаўнічай канторы горжылсаюза і выніні прадставіць бюро гаркома да 1 настрычніка.

Звяно т. САМЦОВА на вяблівым ворыве. (Калгас «Чырвоная трасцянка», Барысаўскага раёна).

ДА АДКРЫЦЦЯ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ПРЫ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

АКАД. П. ГОРЫН

Прэзідэнт Беларускай Акадэміі навук

Гістарычныя веды займаюць першачарговае становішча ў фармаванні светапогляду чалавека. «Мінулае мы вывучаем,—гаворыць **М. Н. Пакроўскі**,—іменна для таго, каб зразумець тое, што адбываецца цяпер». Даць правільнае ўяўленне рабочым масам аб сапраўдным гістарычным развіцці чалавецтва—гэта значыць узброіць іх астрэйшай зброяй у барацьбе за новае соцыялістычнае грамадства. Не дзіва таму, што **гістарычны ўчастак з'яўляецца аб'ектам абвостранай класавай барацьбы.**

У капіталістычных краінах буржуазія не пагарджае ніякімі прыёмамі, каб фальсіфікаваць сапраўдную гісторыю, як гісторыю векавой барацьбы працоўных мас супроць эксплаатацыі чалавека чалавекам. У школьных падручніках капіталістычных краін нахабна **выкідваецца ўсё, што ў малейшай ступені можа наштурхнуць вучня на думку аб необходнасці рэвалюцыйнага знішчэння капіталістычнага ладу.** Асаблівая ўвага аддаецца **барацьбе з інтэрнацыяналізмам**, для чаго шырока культывуецца і распальваецца нацыянальная варожасць.

Нацыяналізм—гэта злейшы векавы вораг пролетарыята, які быў крыніцай паражэнняў рабочых мас у перыяд імперыялістычнай вайны, зноў паднімаецца буржуазіяй на шчыт. У адной з інструкцый італьянскага міністэрства асветы адкрыта гаворыцца, што дабіцца выратавання сваёй бацькаўшчыны (чытай: панавання буржуазіі ў данай краіне) можна толькі шляхам укаранення «яснай нацыянальнай свядомасці». З гэтай мэтай Розенбергі ў Германіі, Студніцкія ў Польшчы і Пірэны ў Бельгіі ўсяляк імкнуцца ўсеагульную гісторыю паказаць, як гісторыю барацьбы Германіі, Польшчы або Бельгіі (чытай: германскай, польскай або бельгійскай буржуазіі) за панаванне над астатнім светам. Гісторыя другіх краін прыпадносіцца, як прыкладная да гісторыі сваёй краіны, канчатковая мэта якой, быццам, векавая барацьба за панаванне над светам (чытай: права сваёй буржуазіі прыгнятаць увесь свет). Не дзіва, што з прыходам Гітлера да ўлады амаль уся ўвага фашысцкай асветы сканцэнтравана на вывучэнні і папулярызацыі Бісмарка, як нацыянальнага героя, старанна выганяецца пры гэтым малейшае ўпамінанне або намёк, што Бісмарк

быў злейшым ворагам працоўных мас.

Выкарыстанне нацыяналізма з'яўляецца апошнім якарам выратавання і для нашай буржуазіі. Невыпадкова нацыяналістычнай атрутай былі шырока прасякнуты такія падручнікі па гісторыі, як Яворскага на Украіне, або Доўнара-Запольскага ў Беларусі. Прыкрываючыся за шырмы адзінства беларускага або ўкраінскага народа, гэтыя фальсіфікатары гісторыі рабілі сваю контррэволюцыйную справу.

Беларускія буржуазныя гісторыкі **Ластоўскі, Доўнар-Запольскі, Цвікевіч, Ігнатоўскі** ўсяляк імкнуліся «абаснаваць» самабытнасць беларускага народа, даказаць адсутнасць у яго класавай барацьбы і адзінства яго радоў у барацьбе за самастойнасць буржуазна-дэмакратычнай Беларусі. У сапраўднасці-ж з гэтых палажэнняў даволі непрыкрыта тырчэлі вушы **сапраўднай контррэволюцыі.** Даказвалася права эксплаатацыі працоўных мас Беларусі, «самастойнасць» разумелася, як адрыў ад Саюза Совецкіх Рэспублік і перадача Беларусі ў лапы фашысцкай Польшчы.

Псеўда-навуковыя контррэволюцыйныя пісанні Ластоўскіх і Доўнар-Запольскіх зараз дастаткова выкрыты перад працоўнымі Беларусі. Поспехі соцыялістычнага будаўніцтва Беларусі змылі гэты контррэволюцыйны накіп.

Марксісцкая гістарычная навука ў Беларусі за апошнія гады атрымала бясспрэчныя поспехі. Выйшлі рад работ па асобных пытаннях гісторыі Беларусі. Да ліку нашых поспехаў бясспрэчна павінна быць аднесена і вышэйшая на днях кніга акад. **В. Шчарбакова** «Нарысы па гісторыі Беларусі», як першая спроба марксісцкага вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі.

За апошні час значна **выраслі і кадры гісторыкаў-марксістаў.** Даволі сказаць, што на сёнешні дзень у ВНУ і навукова-даследчых інстытутах БССР працуе 62 гісторыкі. Праўда, у масе сваёй гэтыя кадры па ўзросту—яшчэ маладыя гісторыкі. З агульнай колькасці 62 гісторыкаў мы маем толькі 8 акадэмікаў і прафесароў, 25 дацэнтаў і 29 асістэнтаў.

Але маладосць, як вядома, не недахоп, а пры той любові да сваёй справы і ўпартасці да работы, якія праяўляюць нашы гістарычныя кадры—гэта лепшая зарука далейшага росту марксісцкай гістарычнай навукі ў Совецкай Беларусі.

Наяўнасць кваліфікаваных кадраў у сваю чаргу дазваляе нам разгарнуць нармальную работу нядаўна арганізаванага **гістарычнага факультэта БДУ**, арганізацыя якога мае выключна важнае значэнне.

Становішча з выкладаннем гісторыі ў сярэдняй школе Беларусі, трэба прама прызнаць, далёка не добрае. Анкетныя даныя, праведзеныя ў часе курсаў па перападрыхтоўцы выкладчыкаў гісторыі сярэдняй школы БССР, выявілі даволі непрывабную карціну, падкрэсліваючую, якое выключна важнае значэнне набывае арганізацыя гістарычнага факультэта пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. Так, з ліку 107 выкладчыкаў, сабраных на курсы, паводле даных дэкана гістарычнага факультэта акад. Шчарбакова, толькі 15 маюць вышэйшую адукацыю, 80—сярэднюю і 12—ніжэйшую. Калі мы пры гэтым зададзім, што прамерная недатагічная работа настаўніка, дасягаючая ў тыдзень 30-50 гадзін, пазбаўляе яго магчымасці павышаць сваю кваліфікацыю, то неабходна будзе сур'ёзна забіць трывогу аб вострай патрэбнасці радыкальнага паляпшэння выкладання гісторыі ў сярэдняй школе.

Сур'ёзным недахопам у выкладанні гісторыі ў сярэдняй школе з'яўляецца **амаль поўная адсутнасць выкладання гісторыі Беларусі.** Так, на пытанне, якое месца займае гісторыя Беларусі ў агульным прадмеце гісторыі, са 107 выкладчыкаў 104 адказалі: «зусім не выкладаем».

Не прыходзіцца даказваць, якое выключнае значэнне ў гэтых умовах набывае разгортванне гістарычнага факультэта. Паставіць выкладанне гістарычных навук у сярэдняй школе на адпаведным узроўні мы зможам толькі ў барацьбе за высокакваліфікаванага выкладчыка. Гэту задачу ў першую чаргу і ставіць перад сабой гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

У гістарычным рашэнні ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб выкладанні грамадзянскай гісторыі, як на галоўны недахоп указвалася, што замест гісторыі вучням прыпадносіцца абстрактныя **соцыялагічныя схемы.** У сувязі з гэтым ЦК ВКП(б) і СНК падкрэслілі необходнасць **канкрэтнасці ў выкладанні гісторыі і ведаў фактаў і дат.**

Гэтая пастанова мае самыя непасрэдныя адносіны і да выкладання гісторыі Беларусі. Мы пры гэтым павінны ўлічваць і спецыфіку нашай работы, не забываць, што мы працуем у краіне, дзе на працягу стагоддзяў беларускія працоўныя масы цярпелі ад памешчыцка-капіталістычнай эксплаатацыі і нацыянальнага ўціску. Толькі Окцябрская рэволюцыя з дапамогай рабочых СССР дала працоўным Беларусі поўнае вызваленне ад нацыянальнага ўціску і адкрыла шырокі прастор росту культуры і навукі на сваёй роднай мове. Беларускія нацыянал-дэмакратычныя элементы ўсяляк стараюцца сарваць правядзенне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Наша задача—падрыхтаваць кадры **выкладчыкаў гісторыі, сапраўдных байцоў за пролетарскі інтэрнацыяналізм,** навучыць іх **ускрываць** прошукі ворагаў, вядучых работу пад фальшыва-нацыянальным сцягам і на багатым гістарычным мінулым Беларусі паказаць, што толькі дыктатура пролетарыята, ажыццяўляемая пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, адзіна здольная вызваліць працоўных ад нацыянальнага ўціску і забяспечыць развіццё соцыялістычнай культуры, нацыянальнай па сваёй форме.

„РУСАНОВ" ЗАКАНЧВАЕ АРКТЫЧНЫ ПАХОД

ЛЕДАКОЛ «РУСАНОВ», 21 верасня (БЕЛТА). У бліжэйшы час «Русанов» заканчвае арктычны паход. За час рэйса праведзены вялікія навуковыя работы па вывучэнню гідралагічнага рэжыма марэй. Сабраны ўзоры морскага грунту, зроблена 200 прамераў глыбіні і 500 аналізаў вады. Штодзень вяліся метэаралагічныя назіранні.



Новы пяцімгвацтарны дом для рабочых у Гомелі.

КАНГРЭС „МІЖНАРОДНАЙ ПАЦЫФІСЦКАЙ ЛІГІ"

ЖЭНЕВА, 15 верасня. (БЕЛТА). У Локарно ў пачатку верасня адбыўся кангрэс «Міжнароднай пацыфісцкай Лігі». Кангрэс быў скліканы на ініцыятыве пэўных швейцарскіх колаў пры фінансавым падтрыманні Ватыкана з памерам скарыстаць рашэнні кангрэса супроць уваходжання СССР у Лігу нацый. Вось чаму пасяджэнне кангрэса было прыурочана да абмеркавання ў Жэневе пытання аб запрашэнні СССР у Лігу нацый.

Сярод асноўных пытанняў у парадку дня было пытанне—«Падзеі бягучага года». У гэтых «падзеях» фігуравала тэма аб уваходжанні СССР у Лігу нацый. Некаторыя члены кангрэса прабавалі скарыстаць гэта пытанне для дэманстрацыі сваіх антысавецкіх пачуццяў. Аднак, старшынствавайны румынскі прафесар Пелла прапанаваў не спыняць спрэчкі і выказацца, ці лічыць кангрэс мэтазгодным уступленне СССР у Лігу нацый, прычым заявіў, што, на яго думку, «вышэйшыя інтарэсы чалавецтва патрабуюць уваходжання СССР у Лігу нацый». У гэтым сэнсе прапанова была прынята кангрэсам амаль аднадушна пры вялікім замяшанні закулісных ініцыятараў з'езда.

АДСТУПЛЕННЕ ПОЛЬШЧЫ У ЖЭНЕВЕ

ПАРЫЖ, 22 верасня. (Інфармацыя «Известий»). Французскі друк з пачуццём задавалення адзначае апошняе выступленне Польшчы ў Жэневе. Як відаць, польскі ўрад, апасаючыся ізаляцыі ў результаце ўсеагульнай рэакцыі на яго першае выступленне, пажадаў уніжуць новага абмеркавання сваёй палітыкі, якое выклікала-б правал польскай прапановы. Польскі ўрад улічыў таксама і папярэджанне Францыі, Англіі і Італіі аб тым, што перагляд дагавора аб нацыянальных меншасцях могбы пацягнуць за сабой змяненне граніц еўрапейскіх краін, што стварыла-б пагрозу для самой Польшчы.

«Пці парыз'ен» па гэтаму поваду піша: «Што асталося ад ультыматыўнай дэкларацыі Бека? Намер, які робіць гонар яго пачуццю нацыянальнай гордасці, і варшаўская ілюмінацыя».

РАЗГАЛОССІ У КІРАЎНІЦТВЕ РЭЙХСВЕРА

ЛОНДАН, 22 верасня. (Інфармацыя «Известий»). Прадказваючы новую рэарганізацыю германскага габінета, спецыяльны карэспандэнт «Манчэстэр гардыен», паведамляе, што ваенны міністр Бломберг можа быць замешчан Фрытчам, які ў сучасны момант займае пост галоўнакамандуючага.

Паводле слоў карэспандэнта, кіраўніцтва рэйхсвера падзяляецца на 2 групы.

Першая, кіраўнікамі якой з'яўляюцца генералы фон-Бломберг і Рэйхенаў — піша карэспандэнт — цалкам салідарна з Гітлерам. Члены гэтай групы — прыхільнікі пагаднення з Францыяй. Прыхільнікі другой школы, узначальваемай Фрытчам, ва многім сходзяцца ў поглядах з Шлейхерам. Што датычыць унутранай палітыкі, то яны хацелі-б зрабіць дыктатарскі рэжым больш ліберальным і, паколькі яны лічаць вайну без падтрымання арганізаваных рабочых немагчымай, яны выказваюцца ў карысць аднаўлення старых профсаюзаў у змененым апалітычным выглядзе. У галіне знешняй палітыкі члены групы Фрытча хочуць дабіцца паляпшэння адносін з СССР. Яны пераконаны ў тым, што Германія рана ці позна павінна будзе біцца з Францыяй і што ёй не трэба аслабляць свае сілы ў рызыкоўных усходніх авантурах. У сучасны момант, — заяўляе карэспандэнт, — вялікім уплывам карыстаецца першая група.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

✦ Профбюракраты з аб'яднанага саюза тэкстыльшчыкаў ЗША аб'явілі аб скачэнні стачкі і прапанавалі 500 тысячам бастуючых 24-га верасня аднавіць работу на аснове прапаноў урадавай камісіі па абследванню канфлікта. Актывісты стачкі кляймяць здрадніцтва профбюракратаў.

✦ Згодна афіцыяльных паведамленняў з Осакі (Японія), там у часе тайфуна разбурана 12 тыс. дамоў, 3.213 фабрык і ўрадавыя склады рысу. Горад Окаяма з насельніцтвам у 160 тыс. чалавек увесь затоплен.

✦ Як паведамляе агенцтва «Гавас» з Мадрыда, урад рашыў аб'явіць з 23-га верасня ўсю Іспанію на становішчы трывогі.

АБ ПРЭМІРАВАННІ ЛЕПШЫХ ПІОНЕРАРГАНІЗАТАРАЎ ЗБОРУ КАЛАСОЎ І АХОВЫ УРАДЖАЮ

Пастанова Савета Народных Камісараў БССР.

Совет народных камісараў БССР пастанаўляе:

Лічыць неабходным прэміраваць 20-30 лепшых піонерарганізатараў збору каласоў і аховы ўраджаю патэфонамі, касцюмамі і бібліятэкамі, на якую мэту адпусціць у распараджэнне ЦК ЛКСМБ 5.000 руб.

Старшыня Савета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Нам. кіраўніка спраў Савета Народных Камісараў БССР І. ПЯТРОВІЧ.

19 верасня 1934 г.

ВЫПУСК ЗООТЭХНІКАЎ

15 верасня ў Дрыбінскім зоатэхнічным тэхнікуме адбыўся чарговы выпуск студэнтаў. На работу ў якасці малодшых зоатэхнікаў у свінагадоўчыя фермы накіроўваецца 29 выпускнікоў, большасць якіх скончыла тэхнікум добра і ўсе праходзілі вытворчую практыку.

ЛАБУСАЎ.

8.500 ТОН МАКАРОН У ГОД

Пасля планавага месячнага рамонту аднавіла работу макаронная фабрыка імя Леніна ў Барысаве. Млын фабрыкі рэканструяван. Прадукцыйнасць яго павялічана з 26 тон у суткі да 31-32 тон. Значна палепшыўся стандарт мукі. Праведзен рад мерапрыемстваў па санітарнаму аздараўленню фабрыкі.

Зараз фабрыка працуе на тры змены. Гадавая праграма—8.500 тон макароны.

АРГАНІЗАЦЫЯ ГАРАДСКОГА САЮЗА СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЕРАЦЫІ

У Менску арганізуецца гарадскі саюз спажывецкай кааперацыі. ЦРК ліквідуецца. Уся гандлёвая сетка ЦРК і ЗРК перадаецца пад веданне Горспажыўсаюза. Справаздачная кампанія ЗРК і былога ЦРК будзе праходзіць з 3-га па 20 кастрычніка. На 22 кастрычніка прызначана гарадская канферэнцыя пайшчыкаў для выбару праўлення Горспажыўсаюза.

У ПАЛЯЎНІЧЫХ

⊙ Паляўнічы зімовы сезон у гэтым годзе пачынаецца ў Беларусі з 1 лістапада. Паляванне праводзіцца на ўсе віды пушнога звера апрача выдры.

⊙ Зараз па Беларусі праходзіць перарэгістрацыя ўсіх паляўнічых і выдача дазвіча паляўнічага білета. Па БССР налічваецца звыш 23 тыс. паляўнічых, якія жывуць у сельскіх мясцовасцях.

Лепшы ўдарнік—шкуроўшчык каблукоў менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча т. ЗІЛЬБЕРГЛЕЙТ І. Промфінплан выконвае на 150 проц. За перавыкананне плана прэміраван.

НОВЫЯ КНІГІ

Выдавецтва Беларускай акадэміі навук выпусціла з друку наступныя кнігі:

Акад. І. ЗАМОЦІН. Метадычныя пытанні выкладання мовы і літаратуры ў II—III канцэнтрах. Стар. 92, цана 2 р. 50 кап.

Аўтар у сваёй рабоце разглядае праблемы методыкі выкладання ў школах мовы і літаратуры, вядомы і вузлавыя пытанні работы па культуры мовы дзяцей вусной і пісьмовай, методыку класнага чытання і работы з кнігай. У кнізе распрацоўваюцца тэмы пытанні арфаграфічнай граматнасці вучняў і паслямоўкі і стылістычных пісьмовых практыкаванняў.

М. Ф. ЯКУШЭВІЧ. Аграглебавы нарыс Жытковіцкага, Тураўскага, Лельчыцкага і Петрыкоўскага раёнаў БССР. Стар. 50 з картамі, цана 2 руб. 50 кап.

Гэта работа падагульвае палявыя наглядзінні і аналітычную апрацоўку матэрыялаў, здабытых глебавай групай комплекснай экспедыцыі Усесаюзнай і Беларускай Акадэміі навук летам 1932 г. у чатырох паўднёва-заходніх раёнах беларускага Палесся.

А. Г. МЕДВЕДЗЕЎ. Глебавы нарыс Бабруйшчыны. Стар. 96 з картамі, цана 3 руб.

Работа тав. Медведзева падагульвае вынікі экспедыцый на Бабруйшчыне, пачынаючы з 1928 г., якія праводзіліся пад агульным кіраўніцтвам акад. Афанасьева.

ГАЗЕТА Ў СОЎГАСЕ

Паліталдзел соўгаса Івань, Слуцкага раёна, пачаў выдаваць друкаваную газету «За социялістычную свінагадоўлю». Ужо выйшаў другі нумар.

ПАВУКА І ТЭХНІКА

ЛІЗАТАТЭРАПІЯ

У апошні час рад інстытутаў і лекавых устаноў СССР, у тым ліку і псіханеўралагічны інстытут Беларускай акадэміі навук, вывучаюць і прымяняюць на практыцы новы метад лячэння — так званую лізататэрапію.

Лізаты—гэта натуральны прадукт бялковага распаду ў клетках жывота арганізма. Да апошняга часу панавала перакананне, быццам прадукты распаду бялка з'яўляюцца непатрэбным і нават шкодным для арганізма матэрыялам. Як шлак пры адліўцы чыгуна, лізаты, на гэту думку, павінны ўдаляцца з арганізма. Аднак, зараз гэты погляд усё больш змяняецца новай тэорыяй, паводле якой прадукты распаду бялкоў адыгрываюць вельмі важную станоўчую ролю ў абмене матэрый, як узбуджальнікі жыццядзейнасці жывой клеткі.

Лізаты, якія ўводзяцца ў арганізм з лекавай мэтай, прыгатаўляюцца штучна, шляхам хімічнай і фізічнай апрацоўкі тканіны розных органаў (страўніка, сэрца, скуры, залоз унутранай сэкрэцыі і т. д.).

Псіханеўралагічны інстытут Беларускай Акадэміі навук на працягу апошняга года займаецца праверкай дзеяння лізатаў на хворы арганізм у клінічнай абстаноўцы. Лізататэрапія пакуль прымяняецца ў нас пры эпілепсіі (падучая хвароба) і некаторых захворваннях залоз унутранай сэкрэцыі.

У вельмі многіх выпадках рэзультаты лячэння лізатамі аказаліся вельмі станоўчымі. У некаторых хворых на эпілепсію заўважалася поўнае спыненне прыпадкаў на працягу 4-5 месяцаў. У хворых на так званую слаповасць (хвароба, пры якой празмерна разрастаюцца тканіны канечнасцей) наступала значнае памяншэнне абёму канечнасцей. У дзяцей з фізічным недаразвіццём на глебе эндакрынных захворванняў заўважалася паскарэнне росту і больш хуткае развіццё.

Аднак, у радзе іншых выпадкаў лізататэрапія не дала чаканых рэзультатаў. Відавочна, яе нельга разглядаць як сродак супроць усіх хвароб. Акрамя таго, недастаткова яшчэ распрацаваны дазіроўка і паказанні да прымянення лізатаў па розных групах захворванняў.

Навуковы супрацоўнік інстытута псіханеўралагіі БелАН І. А. БЕЙЛІН.

«Пікавая дама» у пастаноўцы Беларускага тэатра оперы і балета. НА ЗДЫМКУ: II акт—бал у княгіні.

ВЫПУСК ВАРШТАТАЎ

Кінешскі завод «Комінтарн» Белкультпромтраста, асвоіў выпуск часцей зубаналіных варштатаў для галантарэйнай прамысловасці. Раней гэтыя варштаты ўвозіліся з-за мяжы і каштавалі па 2.500 р. золатам кожны.

Першыя варштаты паказалі высокую якасць. Завод атрымаў заказ на пастаўку 10 варштатаў для харкаўскай галантарэйнай фабрыкі.

Тэатры БССР у новым сезоне

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

Акторы і работнікі Беларускага тэатра оперы і балета, нядаўна закончыўшы летні сезон, знаходзяцца зараз у адпачынку, які працягнецца да сярэдзіны кастрычніка. Першы спектакль новага сезона адбудзецца 26 кастрычніка.

З ранейшых пастановак намі будуць даны сёлета толькі тры—опера «Пікавая дама» і «Князь Ігар» і балет «Чырвоны мак». Адначасова будзе праводзіцца работа над падрыхтоўкай новых пастановак. Чарговымі пастаноўкамі нашага тэатра будуць опера Расіні «Севільскі цырульнік», прэм'ера якой мяцурульнік», балеты «Чырвоны мак» і «Капелія») і апрача таго оперу «Кармен» з нашага старога рэпертуара.

Беларускі тэатр оперы і балета—тэатр зусім яшчэ малады. Поспехі нашых першых пастановак, той цёплы прыём, які мы сустрэлі з боку глядача, друку і ўсёй грамадскасці Беларусі, не павінны ўскружыць нам галаву. Мы добра сабе ўясняем, што пры ўсім росце нашага акторскага і музычнага калектыва, патрэбна штодзённая ўпартая вучоба. На жаль, якраз у гэтай галіне ў нас справа абстаіць найбольш слаба. На гэты тэатральны сезон мы паставілі сабе задачай запрасіць на пастаянную работу рэжысера-педагога і наогул паставіць сістэматычную вучобу з мэтай павышэння кваліфікацыі як усяго калектыва, так і кожнага актора ў паасобку.

Такое сістэматычнае ўдасканаленне здольнасцей і кваліфікацыі кожнага актора тэатра—і спевакоў, і музыкаў, і танцораў—узніме тэатр яшчэ на большую вышыню, узмоніць якасць яго пастановак і разам з тым высуне новыя кадры салістаў тэатра. Наш тэатр мае ў сваім складзе ўжо такія моцныя сілы, як т.т. Александроўская, Млодзік, Пуист. Аднак, далейшае ўзмацненне калектыва як за кошт запрашэння кваліфікаваных актораў з іншых мясцовасцей савэта, так і за кошт высоўвання ўласных сіл, з'яўляецца нашай надзённай задачай.

Асноўнай крыніцай папаўнення тэатра мы лічым нашу Беларускую кансерваторыю. На яе накіраваны нашы ўзрокі. У поспехах навучальнай работы кансерваторыі наш тэатр кроўна зацікаўлен. Вось чаму мы вымушаны адмовіцца ад існаваўшай дагэтуль практыкі сумяшчэння студэнтамі кансерваторыі сваёй вучобы з удзелам у хоры і аркестры тэатра. Гэта ў поўнай ступені адцягвала іх увагу ад вучобы, а пры выездах тэатра на гастролі ставіла-б нас у зусім цяжкае становішча. Для папаўнення балета тэатра мы рыхтуем кадры ўласнымі сіламі. Пад кіраўніцтвам тав. Крэмерэўскага пры тэатры працуе балетная школа.

Найлепшыя перспектывы ўстануць перад нашым тэатрам у сувязі з набудовай будынка Дзяржаўнага Вялікага Тэатра ў Менску, дзе мы здолеем надаць кожнай пастаноўцы самы грандыёзны размах.

Э. Э. БАГІНСКІ.

Нам. дырэктара Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета

МЕНСК

НОВАЯ СТАЛОЎКА

Пры кааперасе завода імя Варашылава адкрылася новая сталоўка. Зала сталоўкі ўмяшчае 200 чалавек. Штодня гатуюцца 320 абедаў.

УМЕЦКІ

⊙

✱ ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ арганізуецца з 1 кастрычніка пры Менскім педагагічным інстытуце замест існуючага аднаіменнага аддзялення.

✱ УЗОРНЫ МЭБЛЕВЫ МАГАЗІН Менгандля адкрыўся на пляцу Волі ў былым будынку Загса. Магазін арганізаваў дастаўку мэблі спажыўцам на дом.

✱ ПАЧАЛІСЯ ЗАНЯТКІ ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Прынята 25 новых вучняў. У музыкальным тэхнікум прынята 150 чал.



Рабочыя-планерысты менскай эле кратастацкай на выпучнанем планера.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Паводле вестак бюро надвор'я ў Менску тэмпература ноччу з 23 на 24 верасня — 6-9 градусаў. Сёння днём 16-19 градусаў, значна змяняючаяся воблачнасць з пераходзячым дажджом к канцу дня. Ветры умераныя, паўднёва-заходніх напрамкаў. Ноччу і раніцой туман. Бачнасць умераная.

⊙

✱ 26 НОВЫХ ЭЛЕКТРЫЧНЫХ ПРАЖЭКТАРАЎ устаноўлена кіраўніцтвам добрабыту ў розных частках горада, у тым ліку ў Грушаўскім пасёлку і студэнцкім гарадку. Да канца года будзе ўстаноўлена яшчэ 14 пражэктараў і 200 электрычных ліхтароў.

Механік і прэзідэнт

(Ад выязной брыгады «Звязды»)

Дзе ўпершыню з'явіўся хром — няжка сказаць. Ва ўсякім выпадку старажытныя рымскія вайскоўцы, насіўшыя драўляны абутак, мелі накаленнікі з нейкай мяккай скуры. Затое дакладна вядома, што дубільны экстракт ператвараючы «скуру» у «кожу», з'явіўся ў Чэхаславакіі і выклікаў да жыцця Фарэлеўскую фірму, хутка захваціўшую манаполію ва ўсім старым свеце.

У 1928 годзе гэта даволі бесцэрэмонная фірма захацела сваім экстрактам драць скуру з совецкіх абутковых трустаў, бо ў нас да 1928 года ўласнай экстрактнай прамысловасці не было. З нас запрасілі 422 р. золатам за тону экстракту.

Але ў нас была досыць добрая цукровая вытворчасць. Хапала дубовых лясоў, было даволі энергічных людзей і была партыя, пад кіраўніцтвам якой Совецкі Саюз вызваляўся ад эканамічнай залежнасці. Гэтых даных было даволі для з'яўлення ў нас дубільна-экстрактнай прамысловасці. І яна з'явілася ў 1930 г. пад настойлівым патрабаваннем скуразводаў для задавалення ўзрастаючых патрэб мільёнаў рабочых і калгаснікаў.

Гісторыя першых дубільна-экстрактных заводаў непарыўна звязана з імем Міхаіла Іванавіча Карпмана. Сын рабочага шаўца, сам шавец, ён добра адчуваў значэнне экстракту. І гэты самародак амаль без усякай тэхнічнай адукацыі паспяхова праектаваць першыя экстрактныя заводы. У 1930 г. ён прыехаў пускаць першы беларускі дубільна-экстрактны завод імя Варашылава ў Рэчыцы.

Завод пабудавалі немец Рольгаузер, асабіста перанёсшы на рыштаванні не адну тону бетона украінец Корбут, збіраўшы адказнейшыя машыны, рэчыцкія драўляні і інш. Пабудаваў завод быў па простым метадзе: з дуба экстракт можна атрымліваць выпарваннем, а з буракоў цукр таксама атрымліваецца выпарваннем. Значыць, чаго тут думаць. Узялі цукровы завод, пераабсталявалі толькі транспарцёр, каб магла ісці драўляная стружка і палічылі завод скончаным.

Тэхдырэктар экстрактнага завода «Дубільпель» тав. КАРПМАН М. І.

Калі звычайна пад'язджаеш да спіртзавода здалёку, чуваць пах кіслай скуры. Завод увесь чорны ад бруду, завод напоўнены парамі. Па заводу цякуць адыходы. Па традыцыі такімі бываюць скуразводы. Пад'язджаючы да рэчыцкага завода, Карпман такога паху не пачуў. Ён убачыў белыя сцены, белую столь, вялікую залу, у якой, з аднаго боку, стаялі выпарныя апараты, з другога—турбіна. І вакол бляск, зяянне, чыстата.

— Так,—сказаў Карпман,—цукар тут варыць можна добры, нават фіранкі ад мух на вокны павесіць можна, толькі я непакоюся, што цукровы завод праз два дні стане скураным, а гата шкада... Між тым з Пакроўска ў Рэчыцу пераехалі 50 сем'яў немцаў, з'явіліся тут таварышы: Рыдэль, Штанг Іосіф, Швемлер, браты Рольгаузеры і іншыя. Немцы склалі асноўны кадр рабочых новага завода. З імі Карпман пусціў завод, і праз тыдзень яго трывога бліскуча апраўдалася.

У трубы, выведзеныя ў вокны, паваліў не цукровы пар, а чорны дубовы дым і зачарніў сцены. Па заводу пацёк не светлы бурачны сок, а густая, ліпкая экстрактная маса. Светлая зала цукровага завода напоўнілася клубамі пары. Пара асядала на выбеленую столь, столь размакала і з яе на турбіну цякла вадзь. Скуразводы не прывыклі да такога суседства турбіны.

І вось цукравары-немцы, механікі і выпаршчыкі разам з Карпманам рашылі: а што калі ўсё-ж такі скураны завод ператварыць зноў у цукровы, дабіцца таго, каб прынцыповая розніца тэхналагічнага працэса не выклікала прынцыповай розніцы ў выглядзе завода. І вось упершыню ў свеце над працуючай з поўнай нагрузкай турбінай будавалі сцены. Упершыню ў свеце маляры без усякіх прыстасаванняў бялілі столь на вышыні 4-павярховага будынка. Адводзілі трубы, чысцілі, рэканструявалі і, вядома, усе кожную дэталь, кожнае прыстасаванне тут-жа самі вынаходзілі. Так завод, прайшоўшы стадыю скураного, зноў вярнуўся да цукровага, захаваўшы толькі скураную прадукцыю.

Пабудавалі не толькі завод, пабудавалі пасёлак, у якім размясцілася 168 сем'яў кадравых рабочых. Кожны рабочы атрымаў гарод, насенне, гаспадарку і вакол завода з'явіліся цудоўныя, прыгожа апрацаваныя гароды, якія могуць так дбайна рабіць нямецкія сяляне.

Механік Рыдэль заробляе зараз на заводзе 270 р. у месяц. Завод даў яму бясплатную кватэру з бясплатным абслугоўваннем. Па сваім агародзе ён сабраў 100 пудоў бульбы. За ўдарную работу Рыдэль атрымаў ад кіраўніцтва завода гадзіннік, а грашовым прэміям ён згубіў лік, памятае толькі, што ў апошні месяц атрымаў 125 рублёў.

Выпаршчык Штанг Іосіф заробляе 290 рублёў штомесячна. Мае гаспадарку пры заводзе, жыве ў лепшай кватэры пасёлка. Два разы адмовіўся ад паездкі ў дом адпачынку. Яму добра адпачываць дома ў пасялковым лесе, слухаючы радыё. Старэйшы нямецкі рабочы Швемлер прыехаў нядаўна з паўднёвага берага Крыма, ды зараз рас казвае пасялковым дзецям пра вялікае мора.

Усё ішло добра. Завод за першае паўгоддзе выканаў план на 107 проц., за жнівень—на 109 проц.. атрымаў 10.000 рублёў прэміі, пачаў будаваць новы будынак, пачалі будаваць клуб, купілі кіно-апарат і раптам такая абурваючая рэч...

Газеты ў краіне прэзідэнта Гітлера пачалі пісаць, што совецкім грамадзянам-немцам, такім як Іосіф Штанг, Рыдэль, Швемлер і інш., жывецца дрэнна, што вымушаны яны ў краіне большэвікоў галадаваць і што сэрдабольныя немцы нават збіраюцца прысылаць дапамогу сваім гаротным аднапляменнікам.

Калі Іосіф Штанг прачытаў, што становішча яго, совецкага грамадзяніна Іосіфа Штанга, у СССР вельмі сур'ёзнае, Іосіф Штанг усміхнуўся і падышоў да механіка Рыдэля. Да іх падышоў Рольгаузер, і яны ўтрох селі на ганку чытаць.

Прагудзеў гудок, у сталоўцы запахла жараным мясам, на прыгарадной гаспадарцы сталі заганяць свіней, радыё заіграла ў пакоях, стары Швемлер паехаў у горад на атрыманай заводам у прэмію машыне, каля фабкома вывесілі аб'яву: «на пасяджэнне выклікаюцца члены фабкома, Рыдэль Штанг, Рольгаузер».

А яны сядзелі, чыталі і смяяліся. Потым механік Рыдэль сказаў:

— Выходзіць тваё становішча, совецкі грамадзянін Іосіф Штанг, сур'ёзнае.

Штанг усміхнуўся.

— Нямецкі грамадзянін Адольф Гітлер хавае ад нямецкіх працоўных праўду пра мяне, а я пра яго ведаю праўду. Я ведаю, што раней у Германіі масла каштавала 38 пфенігаў, а зараз каштуе 1 марку і 10 пфенігаў. Я ведаю, што Дармштадскі і Дрэздзенскі банкі загінулі. Я ведаю, што ў параўнанні з 1929 годам прамысловая прадукцыя ўпала да 66,8 проц. Я ведаю, што ў Германіі тысячы беспрацоўных і галодных, што лепшыя людзі сядзяць там у канцлагерах і іх забіваюць каты. Я ведаю, што прафесары прадаюць газеты на вуліцы. Я ведаю, што гэта зацяжны эканамічны крызіс, які пераходзіць у палітычны...

— Няхай-жа праз яго галаву масы ведаюць яшчэ больш пра нас,— перабівае Рыдэль.

— Ого, няхай яны ведаюць, што мы самі пабудавалі экстрактны завод, які выпускае 4 тоны экстракту ў дзень. Няхай яны ведаюць, што наш экстракт дае 51,5 проц. карысного рэактыву, тады як фарэлеўскі—толькі 50 проц. Няхай яны ведаюць, што мы забяспечваем буйнейшыя совецкія скуразводы «Скороход» і імя Ралзішчэва. Няхай яны ведаюць, што мы навучыліся атрымліваць сухі экстракт, ёмкі для транспартавання, а ў Еўропе здабываюць яшчэ вадкі. Няхай яны, урэшце, ведаюць, што наш завод атрымаў усесаюзнае пяршынства экстрактных заводаў і што тут, на гэтай зямлі, мы знайшлі нашу сапраўдную бацькаўшчыну. Калі ўсім стане ясна, што мы перагналі Еўропу, што ён тады скажа, Рыдэль?..

— Ведаеш, Іосіф Штанг, па-мойму, тады нямецкі грамадзянін Адольф Гітлер будзе вымушан прызнаць, што яго становішча не толькі сур'ёзнае, а проста безнадзейнае...

Б. ПАСКАНЁЎ, С. РУБЕЖЫН.
г. Рэчыца.

Шахматы і шашкі

Пад рэдакцыяй А. А. КАСПЕРСКАГА.

Задачы Н. Ротнікава (Горкі, БССР)

(друкуецца упершыню)



Бел: Крg1, Фа1, Лb5, Лf2, Сf4, Сg4, Кс2, Кf7 на с4, d2, е2, g3 (12)
Чорн. Кре4, Пс3, Лd8, Са7, Сh7, Кс6, Кh8 на b4, g2 h6 (10)
Мат у 2 хады.



Бел: Крa1, Фd2, Лg4, Лh6, Сd4, Сf1, Кe2, Кeg на b3, b4, d5 (11)
Чорн.: Крb5 Фa7, Лf6, Лh1, Сb1, Сh8, Кс7, Кg5, на a5, a6, c2 (11).
Мат у 2 хады.

НА ШАХМАТНЫМ ТУРНІРЫ МАЙСТРОЎ БССР, УКРАІНЫ І ЗАКАЎКАЗЬЯ

ТІФЛІС, 23 верасня. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

22 верасня іграўся другі тур. Выйгралі Кірыпаў у Каспарана. Прайгралі, адмовіўшыся ад нічыёй Раузер Кмоху і Эбралідзе Канстанцінопальскаму. Сыгралі ў нічыю Вераса з Макагонавым М. і Саронін з Макагонавым В. Адкладзены ў роўным становішчы партыі Сліч—Гогідзе і Селезнёў—Рагозін. На першым месцы Канстанцінопальскі (дзве з двух).

Майстар СІЛІЧ.

АД ПАРТКАЛЕГІІ КПК ПРЫ ЦК ВКП(б) ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Партколегія КПК пры ЦК ВКП(б) па Беларускай ССР паведамляе, што 5 верасня 1934 г. у 10 гадзін раніцы ў г. Магілеве будуць разглядацца партканісіяй ПК партсправы наступных таварышоў:

Магілеў: Ефрамава Ф. І., Быкава І. П., Савіна, Наскевіча В. І., Пашкоўскага І. С., Галецкага Ф. І., Палякова А. Я., Катовіча М. К., Ляпешчына С. А., Поліса Л. П., Данілава Д. Е., Ерэмсіна А., Раткевіча П. А., Іванова П. Я., Жыгалко І., Міхалёва К. В.

Чавусы: Сяргеева Е. Ф., Цімашэнка В. К., Ісінава І. А., Парфенава А., Равіса К. Г.

Шклоў: Кузьміна М. І., Шумейка Л. І., Дзамідава Ф. А., Саладкова А. А., Гурынава В. Г., Кавалькова Н. Я., Хальцава У. Ф., Лекеціна Г. П.

Кліча: Літвінава Г. С., Якімавец Ф. В., Паўроза П. Ф.

Быхаў: Дзергачова Г. З., Карпічэнга П. Я., Кірайкова В. І., Франкілах М. Д., Рэкіса К. М., Лук'янава Я. У., Кандратава Е. Р.

Рагачоў: Каржова Ф. Ф., Коцыра Е. Д., Бугаёва П. В., Гольдберга Д., Лапуценка А. Я., Візюк.

Бялынічы: Кармазіна В. А., Глінскага Г. І., Мельніцкага А. Я.

Яўка вышэйпамянёных таварышоў абавязкова, прычым апошнія павінны мець подзывы ад пізных партарганізацый аб сваёй апошняй рабоце.

Член партколегіі КПК па Беларусі РЫЖЫКАЎ.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Дом партактыва пры Менгарко КП(б)Б паведамляе, што сёння ў 7 гадзін вечара ў вялікай зале Дома партактыва адбудзецца даклад старшыні ЦСПСВ тав. Кавальчука для партактыва і прафесіянальнага актыву на тэму «ВЫНІКІ ПЛЕНУМА ВЦСПС І ЦСПСВ АБ ПЕРАБУДОВЕ ПРОФСАЮЗНАЙ РАБОТЫ».

Білеты атрымаць у Доме партактыва.

* * *

Менгарком ЛКСМБ паведамляе, што 26 верасня ў 6 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва адбудзецца ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМА ЛКСМБ па пытанню аб падрыхтаванасці менскай комсамольскай арганізацыі да асенне-зімовай палітвучобы. Білеты ячэйкам атрымаць у ГК ЛКСМБ (пакой № 19).

Сакратар Менгаркома ЛКСМБ ГАЛКОЎСКІ.

СЁННЯ ТЭАТРЫ І КІНО

Першы дзяржаўны тэатр — КАНЕЦ ДРУЖБЫ.
Гукавы кіно-тэатр «Чырвоная зорка» — НОВАЯ ПРАГРАМА.
Гукавы кіно-тэатр «Пролетарый» — НАСЦЕНЬКА УСПІШАЎ.
Кіно-інтэрнацыянал — НОВАЯ ПРАГРАМА.
Кіно «Спартак» — ЗНАК ЗЯРО НА ВЕСНЫ.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы—А. КРУЧКОЎ, ст. рэдактар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — ПЕРАКЛАДНЁЎ, ст. стэрэатыпер — Е. КАГАН, ст. друкар — З. РУБІН.
Нам. адказ. рэдактара А. ДЖЭЛЮК. Уп. Галоўлітбела № К—3234.